Новыя стандарты на аўтамабілі

СТАР. 2

Хлеб і песня Зыслава

СТАР. 5

Што есці, каб даўжэй жыць?

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

1 КРАСАВІКА 2015 г. СЕРАДА № 61 (27919) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СЭЛФІ НА ФОНЕ ВЯСНЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ТРЫМАЦЬ РАЎНАВАГУ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка арыентуе ўрад і Нацбанк на захаванне станоўчых тэндэнцый, якія намеціліся ў першым квартале 2015 года ў эканоміцы. Такую задачу ён паставіў, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова і старшыню праўлення Нацыянальнага банка Паўла Калаура, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў першым квартале з'явілася пэўная раўнавага ў эканамічнай сітуацыі і фінансах. Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць праблемныя пытанні, якія могуць узнікнуць у будучыні і да якіх трэба быць гатовымі.

«Першы квартал закончыўся. Давайце ўсё ж такі пагаворым, як будзем жыць далей і як выйсці да таго, каб, як я ўжо гаварыў пры назначэнні новага складу ўрада, не рвануць наперад у гэтай сітуацыі, але захаваць статус-кво. Ні ў якім разе нельга ўпасці, хоць я і не патрабую, каб вы давалі рост ВУП, яшчэ нейкі прырост. Дай Бог, каб нам выйсці на тыя паказчыкі, якія мы з вамі вызначылі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнту паведамілі аб выніках работы эканомікі за першы квартал 2015 года, сітуацыі ў грашова-крэдытнай і валютнай сферах.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу далейшага забеспячэння макраэканамічнай стабільнасці і захавання збалансаванага развіцця эканомікі.

ДЭБЮРАКРАТЫЗАЦЫЯ ДЗЯРЖАПАРАТУ: МЕРКАВАННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

Згодна з вынікамі сацыялагічнага даследавання, большасць грамадзян, якія звярталіся ў дзяржорганы за апошні год – 71,5%, засталіся ў той ці іншай ступені задаволенымі вырашэннем свайго пытання:



67% удзельнікаў апытання ў той ці іншай ступені ўпэўнены ў даступнасці кіраўнікоў і спецыялістаў мясцовых органаў улады:



Пры гэтым вяскоўцы часцей, чым гараджане, гавораць аб даступнасці кіраўніцтва і спецыялістаў мясцовых органаў улады (74,5% і 65,5% адпаведна).

Сацыялагічнае апытанне дарослага насельніцтва Беларусі (18 гадоў і старэйшага) праведзена 21-31 студзеня 2015 года метадам тэлефоннага інтэрв'ю. У даследаванні прынялі ўдзел 1000 рэспандэнтаў.

Крыніца: Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

© Інфаграфіка БЕЛТА

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 красавіка 2015 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё дзявятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

ЦЫТАТА ДНЯ

Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«У рэйтынгу краін, спрыяльных для мацярынства і нараджэння дзяцей, Беларусь у 2013 годзе займала 26-ю пазіцыю сярод 176 дзяржаў свету. Наша краіна лідзіруе сярод краін СНД (Расія — 62-я пазіцыя, Казахстан — 63, Украіна — 72). Вельмі важна, што створаны роўныя ўмовы для ўсіх катэгорый сем'яў і іх падтрымка ўзмацняецца з нараджэннем кожнага наступнага дзіцяці. Сістэма падтрымкі пастаянна развіваецца. Дапамогамі ахоплена больш за 370 тысяч дзяцей, або 21% ад іх агульнай колькасці. Значныя і аб'ёмы сродкаў, што накіроўваюцца на фінансаванне сістэмы дапамог, — больш як Вr10,8 трлн у 2014 годзе. Усё гэта спрыяе аздараўленню дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, умацаванню сям'і. Летась у нас нарадзіліся 118,7 тыс. дзяцей — гэта самы высокі паказчык за апошнія два дзесяцігоддзі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.04.2015 г.

Долар ЗША	14700,00	▼
Еўра	15830,00	▼
Рас. руб.	255,00	▲
Укр. грыўня	626,87	▼

НА МЯЖЫ ІСНАВАННЯ

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

На пачатку вайны становішча Беларусі было блізкім да крытычнага. Краіна трапіла ў стан «штопара»...

Сёння многа пішацца і гаворыцца пра бітву пад Масквой у снежні 1941-га. А якія падзеі ў тыя дні адбываліся на тэрыторыі Беларусі? Падчас вывучэння гісторыі пытання мне часта прыходзіў на памяць стратэгічны бамбардзіроўшчык «ТУ-16», на якім давялося служыць у 1960-я гады паветраным стралком-радыстам і які аднойчы аказаўся на мяжы штопара (штопар — некіраванае падзенне самалёта па вертыкалі). Нас выратаваў цудоўны рускі чалавек, камандзір паветранага карабля, лётчык 1-га класа, капітан Алёшын... На маю думку, становішча Беларусі летам-восенню 1941 г. нагадвала стан самалёта, які трапіў у штопар.

Штопар, дарэчы, нярэдкая з'ява ў авіяцыі. Але самая вялікая іх колькасць адбылася ў паветры Беларусі за два тыдні да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Тады на асваенне ў 9-ю змешаную авіяцыйную дывізію паступілі 240 самалётаў «МІГ»-1 — «МІГ»-3. З іх засталіся не сапсаванымі толькі 90 — на 206 лётчыкаў. У большасці гібель авіятараў была звязана менавіта са штопарам. «МІГі», — гаворыцца ў справаздачы спецыяльнай камісіі, — пры пілатажы патрабуюць вялікай увагі, бо пры мінімальных нескаардынаваных дзеяннях лётчыка самалёт раптоўна зрываецца ў штопар, а выхад са штопара складаны і патрабуе значнай вышыні». У дакументе падрабязна апісваюцца здарэнні з рулявымі прыборамі і гарматным узбраеннем. Відаць, што прычынай выпадкаў быў не «чалавечы фактар» (лётны састаў), а буйныя завадскія недапрацоўкі. Такім чынам, намёк на няпростую будучыню Беларусі прагучаў яшчэ за тыдзень да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

СТАР. 5

■ Час дзейнічаць

ЛЕГПРАМ ГАТОВЫ НА ЎСЁ!

Абы толькі прадпрымальнікі прасоўвалі беларускае

Днямі падпісаны Указ №143, якім прадугледжана падаўжэнне да 1 студзеня 2016 года пераходнага перыяду, на працягу якога індывідуальным прадпрымальнікам дадзена права рэалізаваць рэшткі тавараў, увезеных без пацвярджальных дакументаў. Неўзабаве ІП, якія гандлююць імпартным таварам, павінны будуць для сябе вырашыць: альбо знайсці добрасумленных пастаўшчыкоў у ЕАЭС (што, на думку прадпрымальнікаў, вельмі праблематычна), альбо звярнуць увагу на беларускую прадукцыю. У сваю чаргу, дзяржава шукае спосабы падняць і рушыць наперад айчынную лёгкую прамысловасць. Для гэтага актыўна склікаюцца ўсе бакі рынку, каб сумесна знайсці рашэнне ў рэжыме дыялогу.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

КАБ ПРАДАВАЦЬ БОЛЬШ, ПАТРЭБНА «СВЕЖАЯ КРОЎ»

Па словах **старшыні «Беллегпрама» Мікалая ЯФІМЧЫКА**, канцэрн жадае аб'яднаць свае намаганні ў прасоўванні беларускай прадукцыі з прадпрымальнікамі і гатовы на любыя формы супрацоўніцтва. Пад гэтым маецца на ўвазе не толькі рэалізацыя тавараў, але і актыўны ўдзел у вытворчасці і адміністраванні прадпрыемстваў. «Ні для каго не сакрэт, што ў «Беллегпраме» сёння ёсць дэфіцыт кадраў — як тэхналагічных, так і кіруючых. З гэтай мэтай створаны так званыя бізнес-інкубатары».

«Мы гатовыя разгледзець ініцыятыўных маладых людзей, правесці пры неабходнасці навучанне і прызначыць на высокую пасаду. Такім чынам канцэрн забяспечвае сябе рэзервам кадраў. Мы хочам бачыць у нас прадпрымальнікаў, таму што ў іх іншае разуменне рынку, працэсаў, якія адбываюцца», — адзначыў старшыня канцэрна.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Парашэнка гатовы вынесці на рэферэндум пытанне федэралізацыі

Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка гатовы вынесці на ўсенародны рэферэндум пытанне аб федэралізацыі краіны і статусе рускай мовы. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы паведаміў падчас сустрэчы са студэнтамі Чарнігаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя Шаўчэнкі. «Я гатовы вынесці на рэферэндум пытанне другой дзяржаўнай мовы і пытанне федэралізацыі і ўпэўнены, што ўкраінскі народ скажа сваё рашучае «не!», — сказаў Парашэнка. Раней аб неабходнасці зацвердзіць асноўныя палажэнні новай украінскай канстытуцыі на ўсеўкраінскім рэферэндуме заявіў прэм'ер-міністр Арсеній Яцанюк. Лідар грамадскага руху «Украінскі выбар» Віктар Медзвядчук падкрэсліў, што прыняць удзел у рэферэндуме аб новай канстытуцыі краіны павінны ўсе грамадзяне Украіны, уключаючы жыхароў Данбаса. Для гэтага, паводле яго слоў, «варта ўрэгуляваць канфлікт на ўсходзе Украіны, выразна і паслядоўна выконваючы ўсе пункты мінскага пагаднення».

Генштаб Чэхіі выступіў супраць размяшчэння пастаяннай базы НАТА

Начальнік чэшскага генштаба Пётр Павел заявіў, што Чэхіі не патрэбна пастаянная база НАТА. «Сіла альянсу не ў такіх базах. Я веру, хутчэй, у мабільныя сістэмы. Лепш мець гнуткія, рухомыя сілы, якія могуць знаходзіцца дзе заўгодна, а не на пастаяннай базе», — сказаў ён. Чэхія і раней выступала супраць размяшчэння базы НАТА, прапанаванага ЗША. У той жа час, НАТА ў найбліжэйшы час прыме рашэнне, ці размяшчаць ваенную тэхніку ў Румыніі. Пра гэта заявіў галоўнакамандуючы НАТА ў Еўропе генерал Філіп Брыдлаў падчас візіту ў Бухарэст. У канцы студзеня генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг пацвердзіў планы альянсу па стварэнні камандных пунктаў і сіл хуткага рэагавання ў Эстоніі, Латвіі, Літве, Румыніі, Польшчы і Балгарыі.

Польшча арганізуе курсы для 50 украінскіх ваенных інструктараў

Польшча ў 2015 годзе правядзе навучанне для прыблізна 50 ваенных інструктараў з Украіны. Пра гэта паведамляе агенцтва Reuters са спасылкай на інфармацыю польскага міністэрства абароны. Гэтыя вучэнні пройдуць у рамках намаганняў НАТА па павышэнні абараназдольнасці Украіны падчас ваеннага канфлікту ў Данбасе. Курсы для ўкраінцаў плануецца правесці на тэрыторыі Польшчы ў чэрвені, верасні і кастрычніку гэтага года, як сказана ў заяве міністэрства. Выдаткі на навучанне аплацыць НАТА і мінабароны Польшчы. Заняткі будуць праходзіць па формуле train the trainers («навучы настаўніка») і дазволяць украінцам пасля вяртання дадому навучаць малодшы камандны састаў Узброеных сіл Украіны.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Газаваныя напоі павышаюць рызыку раку?

Салодкія газаваныя напоі небяспечныя для здароўя. У гэтым няма сумневаў. Іх не раз абвінавачвалі ў правакаванні атлусцення, бо ў газіроўцы ўтрымліваюцца велізарныя порцыі цукру. Аднак зараз спецыялісты Нью-Ёркскага інстытута заяўляюць, што газіроўка здольна выклікаць развіццё анкалагічных захворванняў (перадае The Jewish Times). Высветлілася: вуглякіслы газ, якім насычаюць напой, негатыўна ўплывае на стан мозга. Чым часцей чалавек п'е газіроўку, тым вышэйшая рызыка раку мозга. Больш за тое, вуглякіслы газ, па словах навукоўцаў, адмоўна адбіваецца на кагнітыўным стане мозга ўвогуле — ключавыя працэсы запавольваюцца або зусім тармозяцца. Яшчэ газіроўка небяспечная праз утрыманне канцэрагену — 4-метылімідазолу. Гэта вельмі шкодны пабочны прадукт карамельнага фарбавальніка. Навукоўцы ўжо спрабавалі паўплываць на вытворцаў газіроўкі, але тыя так і не адмовіліся ад яго.

КАРАТКА

Парадак выплаты падаткаў пры аптовым гандлі астаткамі тавараў, якія індывідуальныя прадпрымальнікі ўвезлі без пацвярджальных дакументаў, не зменіўся.

Праект указа аб укараненні сістэмы электроннай чаргі ў аўтадарожных пунктах пропуску праз дзяржаўную граніцу ўнесены на разгляд у Адміністрацыю Прэзідэнта.

У Беларусі назначана 12 тыс. 457 пенсій у адпаведнасці з Дагаворам паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння (па стане на 1 лютага 2015 года). З назначаных пенсій 912 экспартуюцца ў Расію. З Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліку Беларусь пенсіі выплачваюцца 18 тыс. 247 чалавекам.

■ Нетры краіны

На карту пастаўлены кадры

Галоўным накірункам працы геолагаў летась была комплексная здымка ўсёй тэрыторыі краіны з наступным складаннем картаў. Папярэднія геалагічныя карты Беларусі складаліся яшчэ ў 1960-я гады, і за гэты час карэнным чынам змяніліся падыходы да распрацоўкі нетраў.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Інтэрв'ю «Блумбергу»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў разгорнутае эксклюзіўнае інтэрв'ю буйному амерыканскаму медыяхолдынгу «Блумберг», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэзідэнт адказаў на комплекс пытанняў, звязаных з працэсам урэгулявання сітуацыі ва Украіне пасля дасягнення мінскіх пагадненняў у «нармандскім фармаце». «Больш за ўсё насцярожвае тое, што да гэтага працэсу адкрыта не былі далучаныя Злучаныя Штаты Амерыкі. Я лічу, што без амерыканцаў ва Украіне немагчыма ніякая стабільнасць. І сустракаючыся ў апошні час з прадстаўнікамі Злучаных Штатаў Амерыкі, афіцыйнымі прадстаўнікамі, якія ў нас бывалі, я настойліва даводзіў да іх гэты пункт гледжання, заяўляючы пра тое, што я не ведаю, чаго хочуць амерыканцы тут, ва Усходняй Еўропе, ва Украіне ў прыватнасці, але калі амерыканцы хочуць, каб тут быў мір і стабільнасць, яны неадкладна павінны далучыцца да гэтага працэсу», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка спыніўся на ролі вядучых сусветных гульцоў ва ўрэгуляванні ўкраінскай сітуацыі і падтрыманні ваенна-палітычнай стабільнасці ў свеце ўвогуле.

У час інтэрв'ю таксама былі закрануты тэмы перспектыў развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза, валютнай інтэграцыі сярод яго членаў.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў сваё бачанне некаторых аспектаў бягучай эканамічнай, унутрыпалітычнай сітуацыі, у тым ліку ў кантэксце маючых адбыцца важных палітычных падзей у жыцці краіны.

Аляксандр Лукашэнка адказаў і на некалькі пытанняў асабістага характару.

■ Парламенцкі дзённік

З АКЦЭНТАМ НА САЦЫЯЛЬНУЮ ЗНАЧНАСЦЬ

Законапраект «Аб барацьбе з карупцыяй» плануецца прыняць на вясновай сесіі

Заўтра пачынае сваю работу сёмая сесія Палаты прадстаўнікоў. На пасяджэнні Савета ніжняй палаты парламента дэпутаты падвялі асноўныя вынікі сваёй працы ў міжсесійны перыяд і абазначылі прыярытэтныя задачы на будучыню.

— Нягледзячы на тое, што ў гэты час мы правялі пазачарговую сесію і, як вы ведаеце, зацвердзілі Праграму ўрада, да вясновай сесіі мы падрыхтавалі сур'ёзны пакет дакументаў для разгляду, — заявіў **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў,** падчас адкрыцця пасяджэння. — У Палаце прадстаўнікоў зараз знаходзіцца 70 законапраектаў, і 37 мы ўключым ужо ў парадак дня гэтай сесіі. Яны закранаюць амаль усе сферы грамадства: эканоміку і фінансы, сацыяльную палітыку, ахову навакольнага асяроддзя, нацыянальную бяспеку.

Па словах старшыні Палаты прадстаўнікоў, развіццю нацыянальнай эканомікі паслужыць далейшая інтэграцыя ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.

— Хацеў бы асобна адзначыць, што толькі ў бягучым годзе ў рамках ЕАЭС плануецца заключыць больш за 100 міжнародных дакументаў. Пра гэта ішла падрабязная размова падчас пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета ў Маскве. Многія з тых дакументаў нам трэба будзе ратыфікаваць. Акрамя таго, у адпаведнасці з Дагаворам аб ЕАЭС, патрабуецца карэкціроўка больш чым 40 законаў.

Як паведаміў Уладзімір Андрэйчанка, падчас гэтай сесіі парламентарыі працягнуць працу па ўдасканаленні заканадаўства аб пенсійным забеспячэнні, сацыяльным страхаванні, ахове здароўя.

— Гэта тыя пытанні, якія найбольш хвалююць нашых грамадзян, — заявіў старшыня ніжняй палаты. — Будуць унесены змяненні ў законы «Аб знешняй працоўнай міграцыі», «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», прыняты праект закона «Аб альтэрнатыўнай службе». Шэраг заканадаўчых рашэнняў рыхтуецца ў сферы нацыянальнай бяспекі. У найбліжэйшы час, плануем, што гэта будзе 9 красавіка, мы будзем прымаць у першым чытанні законапраект «Аб барацьбе з карупцыяй», які прайшоў шырокае грамадскае абмеркаванне.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Генадзь ГРЫЦКЕВІЧ патлумачыў, што ў парадак дня гэтай сесіі ўключаны 14 законапраектаў, якія неабходна разгледзець у першым чытанні, 5 — у другім чытанні. Таксама плануецца ратыфікаваць 16 дакументаў і прыняць да ведама два дэкрэты Прэзідэнта краіны.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Блізкая ўлада

ПАПАЎНЯЦЬ БЮДЖЭТ РАЗАМ...

Заклікае старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА. У Докшыцах падчас прыёму грамадзян Уладзімір Паўлавіч не даваў папулісцкіх абяцанняў. Але стараўся, як той казаў, «паставіць сябе на месца» людзей. Кіраўніку райвыканкама Алегу Пінчуку, калі апошнія мелі рацыю, адразу ж даручаў аказаць дапамогу.

У «ДРАЗДЫ» ТРАПІЦЬ ПРАСЦЕЙ?

Прыйшлі на прыём грамадзяне, якія жывуць у доме на тэрыторыі санаторыя «Лясное». Хочуць прыватызаваць кватэры. Але па законе гэта немагчыма. Пры гэтым людзей не выганяюць на вуліцу. Жыць могуць, але прыватызаваць метры не маюць права. У незадаволеных свая праўда...

— Мы ж не ведалі, што жыллё службовае! Яшчэ ў часы СССР з поўначы сюды прыехалі, з чарнобыльскай зоны... Калі падавалі дакументы на прыватызацыю, нам адмовілі. Маўляў, жыллё камерцыйнае, — вельмі эмацыянальна тлумачыла жанчына ад імя членаў «ініцыятыўнай групы».

Уладзімір Андрэйчанка яшчэ да гэтай сустрэчы быў у курсе праблемы. І вось чарговая няпростая размова. Але ж чым дапамагчы?

— Адпаведны Указ Прэзідэнта быў прыняты ў 2007 годзе, і ваша жыллё (на тэрыторыі ведамаснага санаторыя КДБ «Лясное». — **Аўт.**) прызнана службовым, спецыяльным... Яно перададзена ў аператыўнае карыстанне санаторыю, — растлумачыў Уладзімір Паўлавіч.

Галоўны ўрач санаторыя Сяргей Табуноў пацвердзіў, што «спрэчныя кватэры» нельга прыватызаваць. Разам з тым, Уладзімір Андрэйчанка пачуў скаргу і наконт жорсткага прапускнога рэжыму.

— Пісалі заявы, нам давалі пропуск на год, як і дзецям нашым... Потым трапіць на тэрыторыю санаторыя стала праблематычна. Але ж калі да мяне ў госці нехта прыязджае, значыць, нясу адказнасць за гэтага чалавека, — працягвала жанчына. І паведаміла пра заявы на пропуск, якія ляжаць непадпісанымі аж з 16 сакавіка.

У адказ Уладзімір Андрэйчанка шчыра здзівіўся, што ў «Лясным» не наладжана прапускная сістэма. І звярнуўся да кіраўніка медыцынскай установы.

— Гэта значыць, устанавілі парадак больш жорсткі, чым на сёння ўехаць у рэзідэнцыю «Дразды», дзе жывуць міністры і дыпламатычныя работнікі. Там парадак такі: я жыву, і ў мяне пастаянны пропуск, як і ў жонкі. Калі, напрыклад, дзеці прыязджаюць, іх прозвішчы ёсць у дзяжурнага на кантрольна-прапускным пункце. Паказалі пашпарты: ёсць у спісе — калі ласка... Людзі не павінны пакутаваць з-за вашай бюракратыі. Калі трэба, выдайце пропуск на год — сказаў спікер парламента. Даручыў старшыні райвыканкама праз некалькі дзён паведаміць, ці знятая праблема.

«ПРЫВАТЫЗАВАЦЬ... ПА ЦАНЕ 1995 ГОДА»

Пенсіянерка Тэрэза Браніславаўна Ісмагілава з вёскі Сітцы агучыла сваю праблему.

— У мінулым годзе звярталася ў ЖКГ... Не хапае грошай на прыватызацыю, — сказала бабуля.

Высветлілася, што ў 1995 годзе падрыхтавала дакументы для прыватызацыі. Але не давяла справу да канца. Цяпер хоча стаць уладальніцай жылля па цане 20-гадовай даўнасці. Вядома, гэта немагчыма. Нават з улікам усіх паніжальных каэфіцыентаў сёння прыватызацыя абыдзецца дзесьці ў 220 мільёнаў рублёў. Першы ўнёсак — 10% — 22 мільёны рублёў. Астатнюю суму трэба «пагасіць» за 40 гадоў. Супрацоўнікі райвыканкама адразу падлічылі, што ў месяц трэба будзе пералічваць на прыватызацыю каля 150 тысяч рублёў. Улічваючы, што ў паважанай пенсіянеркі і яе мужа на дваіх пенсія больш за 5 мільёнаў рублёў, не так ужо і многа. Ды толькі першыя 22 мільёны дзе ўзяць?

Настойлівасць бабулі ў жаданні прыватызаваць «па той цане» міжволі па-добраму рассмяшыла прысутных у кабінеце. Пры ўсім аўтарытэце спікера парламента, ён жа не можа дзеля аднаго чалавека змяніць закон! Грамадзянцы растлумачылі, што плата ў месяц за кватэру, калі яна застанецца арэнднай, будзе большай прыблізна на 30 тысяч рублёў. Сказала, што тады перадумала... Тым больш што яе дзеці на атрыманне ў спадчыну жылля не прэтэндуюць.

«У ГРЫБЫ НЕ ПУСКАЮЦЬ»

Жыхар вёскі, якая знаходзіцца ў 100 метрах ад Брэсцкага біясфернага запаведніка, паведаміў пра немагчымасць збіраць дары лесу.

— Усё жыццё пражылі ля запаведніка, а ў грыбы, ягады нам нельга. А тым, хто жыве ў запаведніку, можна, нават і прыязджым да іх... — сказаў мужчына.

Законам забараняецца збіраць нешта ў лесе, калі не жывеш у запаведніку.

Уладзімір Андрэйчанка параўнаў магчымасць змянення заканадаўства з адпаведным наконт спрошчанай сістэмы перасячэння мяжы з Еўрапейскім саюзам. Зразумела, людзі, якія жывуць па-за межамі вызначаных тэрыторый, таксама просяцца «бліжэй да Еўропы». Дык калі пашырыш адпаведную зону спрошчанага перасячэння, у іншых вёсках незадаволеныя з'явяцца. Маўляў, і ў нас у прыграніччы з таго боку сваякі, магілкі родных...

Наконт грыбоў, можа, і прасцей вырашыць пытанне. Так, закон парушаць нельга. Але ж у кожным канкрэтным выпадку трэба «ўнікаць у сітуацыю». Ды няўжо насамрэч за кошык грыбоў трэба адразу караць?

Жыхары аграрнага гарадка Замасточча і чатырох вёсак мараць пра газіфікацыю. І вышэйзгаданы санаторый мае ў гэтым патрэбу. Мінімальная цана пытання — пара дзясяткаў мільярдаў рублёў. Калі ў складчыну вырашаць праблему, можа, і не зацягнецца на гады. Уладзімір Андрэйчанка абяцаў паспрабаваць паспрыяць яе станоўчаму вырашэнню.

Адказваючы на пытанні журналістаў, спікер парламента падкрэсліў актуальнасць новай рэдакцыі прэзідэнцкай Дырэктывы №2. Нагадаю, яна накіравана на далейшую дэбюракратызацыю.

— Дырэктыва абавязвае чыноўнікаў быць бліжэй да людзей, што мы і стараемся рабіць. У адпаведнасці з ёй, чалавек можа выбраць найбольш зручныя час і спосаб звароту да дзяржаўных служачых. Лічу, што гэта вельмі важна. Згодна з дырэктывай трэба вырашаць пытанні і праблемы на карысць насельніцтва — без цяганіны, бюракратызму, фармальнага стаўлення. Але сярод іншых ёсць незаконныя просьбы, а таксама пытанні, якія патрабуюць вялікіх фінансавых выдаткаў. Атрымаўшы адмову, людзі скардзяцца ў іншыя органы. Будзе нармальна працаваць эканоміка, зароблены грошы, у выніку можна будзе вырашаць больш пытанняў, — адзначыў Уладзімір Паўлавіч.

І дадаў, што ў напаўненні бюджэту грамадзяне могуць браць удзел больш актыўна. Напрыклад, для адкрыцця сваёй справы ў Беларусі стварылі прывабныя ўмовы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Докшыцы — Віцебск

■

На карту пастаўлены кадры

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах **начальніка ўпраўлення па геалогіі Мінпрыроды Уладзіміра ВАРАКСЫ,** тое, што адкрыццяў новых буйных радовішчаў не адбылося, не сведчыць пра адсутнасць вынікаў працы геолагаў. Адкрываюцца новыя невялікія радовішчы, пашыраецца праца на ўжо існуючых. У 2014 годзе па такіх відах карысных выкапняў, як нафта, мергельна-мелавыя пароды, даламіты, гравійна-пясчаныя сумесі, будаўнічыя пяскі, гліны, торф, прэсныя падземныя воды прырост запасаў пераўзышоў зададзеныя аб'ёмы. Былі ўведзены ў эксплуатацыю дзве нафтавыя свідравіны: Заходне-Калінінская №5 і Рэчыцкая №310g. Рыхтуюцца да бурэння яшчэ тры перспектыўныя для здабычы нафты структуры. Дзякуючы намаганням геолагаў, за апошнія тры гады Беларусь выйшла на стабільны ўзровень уласнай здабычы нафты, які роўны 1640—1650 тысячам тон. У прамысловую распрацоўку для прадпрыемства «Беларуськалій» было перададзена Петрыкаўскае радовішча калійнай солі, вядзецца праца па перадачы Любанскага радовішча солі замежнаму інвестару.

Акрамя Беларусі, айчынныя спецыялісты працуюць і ў іншых краінах: Расіі, Лаосе, Манголіі, ёсць перспектывы для супрацоўніцтва з Балівіяй і Эквадорам. Так, напрыклад, з Расіяй рэалізуецца сумесны праект «СКІФ-Нетры», у рамках якога распрацоўваецца праграмнае забеспячэнне і ствараюцца суперкамп'ютары для апрацоўкі выкапняў. З Балівіяй вядуцца перамовы аб правядзенні разведкі і сумеснай распрацоўкі радовішчаў жалезнай руды і калійнай солі на тэрыторыі паўднёваамерыканскай краіны. Стварэнне лабараторыі па вызначэнні якасці пародаў і руд абмяркоўваецца з Лаосам.

Пытанне падрыхтоўкі спецыялістаў закрануў **генеральны дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі» Андрэй КАЎХУТА.** Ён зазначыў, што так званага «кадравага голаду» ў сферы няма, але адчуваецца патрэба ў спецыялістах высокага ўзроўню для спецыфічных работ. Гэта праблема характэрна для ўсіх постсавецкіх краін. Так, напрыклад, для распрацоўкі падземнай здабычы патрабуюцца геолагі з вялікім вопытам працы, бо любая памылка можа прывесці да буйных фінансавых страт. Акрамя гэтага, Андрэй Каўхута заўважыў, што якасна прыток выпускнікоў геалагічных спецыяльнасцяў беларускіх ВНУ за апошнія гады стаў лепшым.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

ЛЕГПРАМ ГАТОВЫ НА ЎСЁ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таксама ў «Беллегпраме» прадпрымальнікам гатовы даць як электронную пляцоўку для гандлю, так і арганізаваць працоўныя месцы.

«Амаль усе беларускія вытворцы лёгкай прамысловасці маюць гандлёвыя інтэрнэт-пляцоўкі. Аднак не ўсе з іх працуюць эфектыўна. Самымі эфектыўнымі сёння з'яўляюцца «Мілавіца», «Белвест», «Галантэя» і яшчэ каля 30 актыўных інтэрнэт-прадаўцоў. Мы маем сучасныя тэхналогіі, каб прасоўваць беларускую прадукцыю», — падкрэсліў Мікалай Яфімчык.

ДОЛАР ЗА МЕТР І ІНШЫЯ ПРАПАНОВЫ

Адзін з асноўных сектараў, якому неабходна задаць вектар на прыбытак, — ільняная галіна.

«Мы гатовыя даць квадратны метр за 1 долар у Цэнтры моды ў Мінску для рэалізацыі праекта з ільном. Ад вытворцы спатрэбіцца ідэя і дызайн. Праект вельмі ліквідны з-за вялікай папулярнасці экалагічна чыстай тканіны ў Еўропе», — заявіў старшыня канцэрна «Беллегпрам».

Ён таксама падкрэсліў, што канцэрн гатовы падтрымаць пачынанні прадпрымальнікаў у абутковай і тэкстыльнай вытворчасці. Для таго, каб беларускія тавары прадаваліся, неабходна наладзіць інфармацыйную частку продажу. З гэтай мэтай плануюць распрацаваць інтэрнэт-рэсурсы, дзе, напрыклад, вытворцы і прадаўцы змогуць размяшчаць прапановы, атрымліваць інфармацыю пра свабодныя плошчы і абсталяванне, а пакупнікі бачыць тое, што ім цікава.

«Магчымасці ёсць. Нам патрэбны людзі, здольныя рушыць наперад нашу прадукцыю. Стварыць для яе адпаведны імідж і дызайн», — адзначылі прадстаўнікі «Беллегпрама».

У сваю чаргу, спрабуючы знайсці агульную мову, прадпрымальнікі ўносілі прапановы па многіх пытаннях. У прыватнасці, гэта тычыцца арэнды гандлёвых плошчаў. У гандлёвых цэнтрах яна занадта высокая, і прадпрымальнікам цяжка спраўляцца, маючы ў сваім асартыменце толькі беларускія тавары. Неабходна мець вялікі працэнт імпарту, каб выйсці на станоўчы ўзровень рэнтабельнасці.

Успомнілі і аб праблеме інтэрнэту, дзе цяпер вялікую прастору займаюць рэкламныя банеры з кітайскай прадукцыяй, што натуральна запавольвае прасоўванне беларускіх тавараў. Але, як аказалася, самым вострым пытаннем для прыватных і дзяржаўных вытворцаў з'яўляецца малая колькасць сыравіны і фурнітуры для пашыву адзення. Бо магчымасць шыць модную вопратку ёсць, але няма з чаго. Прадпрымальнікі ўнеслі прапанову бяспошлінна ўвозіць тканіну ў Беларусь. Страціўшы трохі на імпарце сыравіны, ёсць магчымасць актывізавацца вытворчым прадпрыемствам усіх відаў уласнасці. Як адзначылі прысутныя на дыялогу ІП, сёння прыватнаму прадпрыемству нявыгадна імпартаваць тканіны самастойна.

СЭКАНД-ХЭНД АБО СТОК?

Таксама цікавы і той факт, што многія прадпрымальнікі скардзяцца на нядобрасумленную канкурэнцыю з боку сэканд-хэндаў. І справа не ў тым, што паношаную вопратку раскупляюць хутчэй. Вельмі часта ў такіх крамах прадаецца не толькі адзенне, якое было ва ўжыванні, але і стокі — рэшткі партый адзення, якія не маюць асартыменту. Ставіцца пад сумненне наяўнасць сертыфікатаў на гэтую прадукцыю і яе якасць.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

■ Стандарты

АЎТО — НЕ НІЖЭЙ ЗА ЕЎРА-4

Такія патрабаванні ўстаноўлены з 1 красавіка

Стандарты былі і застаюцца мовай міжнародных зносінаў і свабоднага гандлю. Таму старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА агучыў наша важкае слова: вяртаемся да практыкі праверкі тэхнічных умоў па шэрагу прадукцыі і ўводзім новыя стандарты і экалагічныя патрабаванні для тых аўто, якія ўвозяць.

ЗНОЎ АБАВЯЗКОВАЯ ПРАВЕРКА?

Віктар Назаранка заявіў, што ў Беларусі могуць вярнуцца да практыкі абавязковай праверкі тэхнічных умоў па цэлым шэрагу відаў прадукцыі.

«У нашай прадукцыі сёння няма іншай альтэрнатывы, акрамя той, каб, як мінімум, утрымліваць свой рынак і пастаўляць як мага больш тавараў на знешнія рынкі. І адзінае выйсце — гэта забяспечыць вельмі высокі ўзровень якасці прадукцыі, таму што коштавая канкурэнцыя аказваецца вельмі неэфектыўнай ва ўмовах ваганняў курсаў, змены арыенціраў. Таму пазіцыя камітэта такая: мы падтрымліваем ідэю, што па цэлым шэрагу відаў прадукцыі трэба вярнуцца да праверкі тэхнічных умоў, каб гарантаваць яе якасць і канкурэнтаздольнасць», — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

Па словах Віктара Назаранкі, праект пастановы ўрада падрыхтаваны і адпраўлены на ўзгадненне. У першую чаргу гэта будзе тычыцца складанатэхнічнай прадукцыі, і, верагодна, харчовай.

У дадзены момант у Беларусі дзейнічае 25 тысяч дзяржаўных стандартаў, тэхнічных умоў у фондзе ТУ — 27678. З іх па 20% адносяцца да сферы машынабудавання, электратэхнікі, электронікі, сувязі, прыкладна столькі ж — да сельскай гаспадаркі і харчавання, 17% — да хімічнай прамысловасці.

АДПАВЯДАЦЬ 4-МУ ЭКАЛАГІЧНАМУ КЛАСУ

Аўтамабілі, старэйшыя за 2007 год выпуску, якія ўвозяцца ў Беларусь фізічнымі асобамі, з 1 красавіка павінны будуць адпавядаць экалагічнаму класу 4 і вышэйшаму.

«Дзяржстандартам прынята пастанова, якая прадугледжвае, што з 1 красавіка ўсе машыны, старэйшыя за 2007 год, якія ўвозяцца фізічнымі асобамі, павінны будуць да афармлення ў ДАІ мець доказ таго, што яны маюць экалагічны клас, не ніжэйшы за 4-ы», — сказаў кіраўнік ведамства.

«Сёння ў краіне разгортваецца сетка лабараторый, якія будуць праводзіць гэтую працу. У асноўным працэдура будзе звязана з дакументальным кантролем, ацэнкай існуючых баз даных, як у нашай краіне, так і ў нашых калег», — удакладніў Віктар Назаранка. На яго погляд, працэдура пацвярджэння адпаведнасці аўтамабіляў патрабаванаму экалагічнаму класу не будзе для грамадзян цяжкай.

«Працэс запушчаны: спачатку вельмі старыя аўтамабілі павінны будуць даказаць, што адпавядаюць 4-му класу, з кожным годам гэтая планка будзе павышацца — і па ўзросце, і па экалагічным класе», — дадаў кіраўнік Дзяржстандарта.

Гэтая мера адпавядае нормам тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы колавых транспартных сродкаў».

8 МЛРД НА НОВЫЯ СТАНДАРТЫ

Беларусь у 2015 годзе выдаткуе каля 8 млрд рублёў на распрацоўку нацыянальных стандартаў.

Віктар Назаранка адзначыў, што ў сярэднім Беларусь распрацоўвае да 300 новых арыгінальных стандартаў у год, прыкладна 200 з іх патрэбны для таго, каб рэалізаваць патрабаванні тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза. Пры гэтым патрэба краіны ў стандартах на сёння ўдвая большая — да 600 стандартаў. На распрацоўку яшчэ 300 дакументаў, па словах Віктара Назаранкі, сродкаў няма.

Кіраўнік Дзяржстандарта прывёў у якасці прыкладу Расійскую Федэрацыю, дзе штогод распрацоўваецца больш за 1,5 тысячы стандартаў, 50% фінансавання бярэ на сябе дзяржава, астатнія 50% — бізнес. «Пры гэтым вельмі актыўна буйны расійскі бізнес падключаецца не толькі да фінансавання, але і да распрацоўкі гэтых стандартаў», — удакладніў старшыня камітэта.

Што тычыцца Беларусі, то, па словах **начальніка ўпраўлення тэхнічнага нармавання і стандартызацыі Дзяржстандарта Аксаны ГРЫШКЕВІЧ,** традыцыйна 60% фінансавання распрацоўкі стандартаў складаюць сродкі рэспубліканскага бюджэту, па 20% — сродкі арганізацый-распрацоўшчыкаў і сродкі інавацыйных фондаў канцэрнаў, міністэрстваў і дзяржкамітэтаў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

РАЗЛІЧЫЛІСЯ З МВФ

Беларусь 31 сакавіка 2015 года пагасіла апошнюю частку абавязацельстваў па крэдыце стэнд-бай МВФ, пра што паведамілі ў Міністэрстве фінансаў.

Выплата склала 75,9 млн долараў ЗША. «Такім чынам, рэспубліка цалкам выканала свае абавязацельствы перад МВФ», — падкрэслілі ў міністэрстве.

Нагадаем, што Беларусь рэалізавала праграму стэнд-бай, падтрыманую крэдытам МВФ на 3,5 млрд долараў, у перыяд са студзеня 2009 года па красавік 2010-га. Гэта дазволіла краіне забяспечыць станоўчую дынаміку па шэрагу пазіцый у эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ЧАРГАВІКОЎ СТАЛА НА 31 ТЫСЯЧУ МЕНШ

Аднак у краіне яшчэ застаецца 153,4 тысячы грамадзян (сям'яў), якія стаяць на жыллёвым уліку 10 гадоў і больш.

Сёлета на пачатак года ў чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, стаіць 742,2 тысячы чалавек (сем'яў), што на 30,8 тысячы менш, чым год таму. У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу колькасць чаргавікоў паменшылася на 27,5 тысячы, а ў сельскіх населеных пунктах — на 3,3 тысячы грамадзян (сем'яў), паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.

У агульнай колькасці жыллёвых чаргавікоў асноўную долю складаюць гарадскія жыхары — 90,1%, а доля сельскіх усяго толькі 9,9%. Спецыялісты Белстата адзначаюць, што памяншэнне колькасці грамадзян (сем'яў), якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, адбылося ў асноўным за кошт жыхароў Мінска і Брэсцкай вобласці (13,2 тысячы і 5,2 тысячы грамадзян адпаведна). Цяпер патрэбу ў жыллі маюць 344,9 тысячы маладых сем'яў (46,5%), 24,9 тысячы шматдзетных сем'яў (3,4%), а таксама 19,3 тысячы грамадзян, якія маюць права на атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання (2,6%). Экспертамі камітэта было падлічана, што на канец мінулага года 153,4 тысячы чалавек у краіне, ці 20,7%, стаяць на ўліку 10 гадоў і больш.

Між іншым, толькі за мінулы год колькасць чаргавікоў, якія стаяць на ўліку 10 гадоў і больш, зменшылася на 1,2 тысячы (0,8%), а тых, што жывуць у інтэрнатах, — на 6 тысяч (4,8%) чалавек. Усяго летась атрымалі жыллё і палепшылі жыллёвыя ўмовы 36,6 тысячы чалавек (сем'яў), ці 4,7% ад агульнай колькасці чаргавікоў. Сярод іх 15,5 тысячы маладых сем'яў, 5,9 тысячы шматдзетных сем'яў і 3,3 тысячы грамадзян, якія маюць права на атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання.

Сяргей КУРКАЧ.

ПАДТРЫМАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ І ТВОРЧАСЦЬ

Менавіта гэта стала лейтматывам сустрэчы старшыні Мінскага аблвыканкама Сямёна Шапіры з творчай інтэлігенцыяй Мінскай вобласці.

Размова доўжылася дзве гадзіны. Не было прамоў і доўгіх выступленняў. Дзеячы мастацтва выказваліся аб набалелым. А Сямён Барысавіч і кіраўніцтва вобласці ўзялі «на ўлік» усе клопаты і праблемы. Як высветлілася, шмат што вырашаецца і можа быць вырашана. Відаць, дзеля гэтага якраз і патрэбен такі кантакт, у якім адкрыта ставяцца розныя, няхай сабе часам і няпростыя, пытанні. Удзел у размове з кіраўніцтвам Мінскай вобласці прынялі народны мастак Беларусі Іван Міско, народныя артысты Марыя Захарэвіч і Міхаіл Фінберг, вядомыя дзеячы культуры Алег Елісеенкаў, Рыгор Сарока, Барыс Цітовіч, Сяргей Давідовіч, Валянціна Гіруць-Русакевіч, акцёры, музыканты, кампазітары, пісьменнікі, мастакі, скульптары, архітэктары. Кожнаму хацелася выказацца пра найбольш важнае і актуальнае на яго погляд.

Пасля гэтай сустрэчы, як паабяцаў Сямён Шапіра, будуць і наступныя. Але ўжо зараз размовы, чыесьці маналогі сталі падставай для арганізацыі пленэраў, пашырэння гастрольнай дзейнасці тэатральных і музычных калектываў, рэалізацыі іншых творчых праектаў, выдання новых кніг. Важна разумець адно — пра што адкрыта і гаварыў старшыня Мінскага аблвыканкама: у большай, значнай ступені можна падтрымаць ініцыятыўных, тых, хто разумее, што мастацкая, творчая дзейнасць патрабуе самаахвярнай працы, што яна так ці іначай спалучана з ініцыятывай і гарэннем.

Сяргей ШЫЧКО.

НЕЗАКОННЫ... БЯРОЗАВІК

Работнікі Брэсцкай аблінспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету распачалі адміністрацыйны працэс у дачыненні да жыхара вёскі Лешніца Маларыцкага раёна. Папярэднічала яму ледзьве не дэтэктыўная гісторыя.

Кіруючы трактарам без нумарных знакаў з прычэпам, парушальнік не выканаў патрабавання спыніцца і паспрабаваў з'ехаць. Падчас пераследу прычэп... адарваўся. У ім дзяржінспектары знайшлі сем палімерных ёмістасцяў з бярозавікам. Законнасць яго нарыхтоўкі высвятляецца. Складзены пратакол за непадпарадкаванне службовай асобе пры выкананні ёй сваіх паўнамоцтваў.

ДАДЗІМ СУДАКУ СПАКОЙНА АДНАВІЦЦА

З 1 красавіка па 30 мая пастановай Мінпрыроды ад 19 сакавіка 2014 года №6 ва ўсіх рыбалоўных угоддзях краіны забараняецца аматарская лоўля судака.

Ва ўказаны перыяд цалкам забараняецца аматарскае рыбалоўства ў месцах масавага нераставання гэтага віду: у Лунінецкім раёне — на канале Мікашэвіцкі на працягу 2,5 кіламетра ўверх па каналe ад месца ўпадзення яго ў Прыпяць, на Прыпяці на адлегласці 500 метраў уверх і ўніз па цячэнні ад месца ўпадзення ў яе Мікашэвіцкага канала; у Гродзенскім раёне — на Аўгустоўскім канале ад шлюза каля вёскі Нёмнава да месца ўпадзення яго ў Нёман, на пойменных вадаёмах Нёмана — Келбаскай затоцы каля вёскі Келбаскі, Беражанскай затоцы каля вёскі Беражаны; у Мастоўскім раёне, на пойменных вадаёмах Нёмана: возеры Стары Нёман-1 каля вёскі Харціца, возеры Вінабойскае і возеры Новае каля вёскі Навінка, затоне без назвы каля вёскі Дубна; у Магілёве і Магілёўскім раёне — на ўчастках Дняпра і прылеглых пойменных вадаёмах у межах ад водазабору Магілёўскага аўтамабільнага завода імя С.М. Кірава да вусця ракі Дзебра.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАНАДТА КАШТОЎНЫ АЎТОГРАФ

Шматмільённыя штрафы давядзецца выплаціць 20-гадоваму жыхару Хойнікаў, які вучыцца ў адным з гомельскіх каледжаў.

Акрамя асноўнай спецыяльнасці, малады чалавек асвоіў за час навучання так званы «тэгінг» — сумнiўнае «мастацтва» распісвацца на сценах грамадскіх будынкаў. Ён так захапіўся «творчасцю», што міліцыі прыйшлося правесці спецыяльную аперацыю па вылічэнні злодзея, пра гэта расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Між тым, мэта «тэгера» — пакінуць сваё імя (творчы псеўданім) на як мага большай колькасці аб'ектаў. Але менавіта гэта і дазволіла праваахоўнікам ідэнтыфікаваць рэальную асобу, якая, акрамя таго, засвяцілася і ў сацыяльных сетках. Сваё дачыненне да фасаднага «мастацтва» ён ужо прызнаў. У адносінах да хлопца складзены адміністрацыйны пратакол за дробнае хуліганства, які накіраваны ў суд Цэнтральнага раёна горада Гомеля. Акрамя таго, цяпер зацікаўленыя арганізацыі рыхтуюць іскі аб спагнанні з маладога чалавека прычыненай ім матэрыяльнай шкоды. Сума, відавочна, будзе вылічацца дзясяткамі мільёнаў рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў КРАСАВІКУ

1, серада, **7.00 – 13.00**	*11, субота* **16.50 – 0.00**
3, пятніца, **4.30 – 08:30**	*12, нядзеля* **0.00 – 8.30**
4, субота, **0.00 – 0.30,**	*13, панядзелак* **7.40 – 16.10**
4.00 – 24.00	*15, серада* **4.30 – 7.00**
5, нядзеля **0.00 – 5:00,**	*18, субота* **2.30 – 4.30**
13.00 – 24.00	*20, панядзелак* **19.30 – 24.00**
6, панядзелак **0.00 – 2.30**	*21, аўторак* **0.00 – 14.30**
7, аўторак **8.00 – 24.00**	*26, нядзеля* **6.50 – 0.30**
8, серада **0.00 – 11.30,**	*27, панядзелак* **10.30 – 24.00**
14.00 – 18.30	*28, аўторак* **0.00 – 2.30**

■ Наўздагон

«Аднойчы ўсе мы будзем шчаслівыя»

За гэты спектакль з вельмі аптымістычнай назвай у Магілёве выказаліся аднадушна ўсе ўдзельнікі «М.@rt.кантакту» — і моладзь, і тэатразнаўцы, і гледачы.

Вынікі тэатральнага форуму «М.@rt.кантакт» па традыцыі падвялі ў Магілёве ў міжнародны дзень тэатра. Упершыню за 10 гадоў існавання праекта гэтыя функцыі былі ўскладзены на маладзёжнае журы. На працягу тыдня Магілёў убачыў 19 спектакляў у выкананні калектываў з 10 краін. П'есу былой вучаніцы вядомага ўральскага рэжысёра Мікалая Каляды Кацярыны Васільевай «Аднойчы ўсе мы будзем шчаслівыя», якая б'е па нервах, у інтэрпрэтацыі маладога рэжысёра Вячаслава Чабатара гледачы ўбачылі на трэці дзень фестывалю. І адразу прароцкімі сталі кімсьці пакінутыя на імправізаваній сцяне водгукаў «М.@rt.кантакта» словы: «Гран-пры, не менш». Жорсткая, але кранальная гісторыя дзяўчынкі, якая пакутуе ад падваення асобы, у выкананні таленавітых актрыс маскоўскага Цэнтра імя Мейерхольда Анастасіі Пронінай і Аляксандры Кузенкінай узрушыла «да дрыжыкаў, да мурашак па скуры, да камяка ў горле». Іх яскравую гульню маладзёжнае журы адзначыла яшчэ і асобна ў намінацыі «За шчасце». Вельмі выразнай атрымалася гэтая вечная барацьба цемры са святлом. Тэатразнаўцы выказвалі дзіўную аднадушнасць у сваіх адзнаках. Пастаноўка адзіная з 19 фестывальных не атрымала з іх боку ніводнай крытычнай заўвагі. Беларускі крытык Таццяна Арлова прызналася: «Калі я яе праглядзела, у мяне прапаў дар маўлення, рэжысёрская работа проста ювелірная. Убачанае на сцэне называлі прарывам, адкрыццём, падзеяй, «жывым тэатрам». Айчынныя эксперты наогул марылі ўголас, каб таленавіты рэжысёр Яўген Чабатар нешта падобнае зрабіў на беларускай сцэне. Ён, дарэчы, вельмі зацікавіўся такой перспектывай. Затрымка толькі за тымі, хто запрасіць яго ў Беларусь. Сам ён прызнаўся, што нават на фестываль марыў трапіць яшчэ з 2011 года.

Сярод іншых работ, якія адзначала моладзь, постмадэрнісцкая камедыя ў адным дзеянні «Шэкспір» у выкананні драматычнага тэатра імя А. Венгеркі з Беластока («За лепшы тэатральны комікс»), спектакль Рускага тэатра Эстоніі з Таліна па аповесці Мікалая Гогаля «Гульцы» («За філіграннае шулерства»), міжнародны праект тэатра «NiMu» (Германія, Аўстрыя, Іспанія, Беларусь) «Завядзёнка/Einleben», прадстаўлены таленавітай беларускай рэжысёркай Кацярынай Аверкавай («За пошук адказаў»). Яна, дарэчы, некалькі гадоў працавала рэжысёрам Магілёўскага драмтэатра. «За тонкую, чыстую і крыштальную рэжысуру» адзначаны Андрэй Сідзельнікаў, тэатральную версію бунінскага апавядання «Міцева каханне» якога паказаў Дзяржаўны драматычны тэатр «На Ліцейным» з Санкт-Пецярбурга.

Артысты з Санкт-Пецярбурга (тэатр «Прытулак камедыянта») прыехалі на форум з супярэчлівай версіяй таленавітага расійскага рэжысёра Васіля Бархатава славутай п'есы «Каварства і каханне».

Пасля яркага тэатральнага тыдня нават цяжка ўвайсці ў працоўны стан. Затое можна на працягу года смакаваць яго паслясмак. А паразважаць над чым сапраўды ёсць. Шмат розных тэатральных школ, формаў, знаходак. Крытыкі ў адзін голас адзначалі, што за тыя 10 гадоў, якія існуе фестываль, Магілёўскі драматычны тэатр значна вырас. Дастаткова ўзгадаць апошнюю пастаноўку «Жаніцьба» ў інтэрпрэтацыі рэжысёра драмтэатра Саўлюса Варнаса. Яна таксама была паказана на М.@rt.кантакце. Эксперты заўважылі, што тэатр выйшаў ужо на іншы, міжнародны, узровень, дзе класічныя творы набываюць зусім іншае гучанне. Такога Гогаля з ілюзіямі, саксафонам і ролікавымі канькамі сапраўды яшчэ не было.

Па традыцыі на фестывалі працуюць вядомыя тэатразнаўцы з розных краін. Дацэнт Варшаўскага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, тэатральны крытык і перакладчык Андрэй Масквін кожны раз знаходзіць на форуме нешта новае. А на юбілейным, адзначыў ён, як ніколі была вельмі моцная канкурэнцыя паміж удзельнікамі.

Тэатразнавец даўно цікавіцца беларускай драматургіяй. Першы том яго анталогіі выйшаў раней, а на форуме ён прадставіў чарговы двухтомнік, у які ўвайшлі п'есы 13 маладых беларускіх драматургаў. «Я часта бываю ў Беларусі на розных тэатральных фестывалях, адсочваю цікавых аўтараў, з некаторымі нават знаёмы, — тлумачыць ён. — Спачатку была мінская «Панарама», потым «М.@rt.кантакт», «Белая Вежа», фестываль беларускай драматургіі ў Бабруйску. Яны мне дазволілі наладзіць кантакты з аўтарамі. З некаторымі я звязваўся па электронай пошце. Андрэя Іванова, напрыклад, не ведаў, але прачытаў, што ён паставіў сваю п'есу ў Нарыльску, і напісаў яму. Цікава ж: беларус, а запатрабаваны ў іншай краіне. Патлумачыў яму, што існуе такі праект, што хачу перакласці яго твор на польскую мову і выдаць. І ён згадзіўся».

Артысты прыслухоўваюцца да крытыкаў.

Ілья Дэль — сучасны Фердынанд славутай п'есы «Каварства і каханне», тэатр з Санкт-Пецярбурга «Прытулак камедыянта».

Тыраж анталогіі невялікі, усяго 100 асобнікаў, але ў продажы ён будзе толькі ў Польшчы. Што датычыцца Беларусі, то адзін асобнік аўтар паабяцаў перадаць у Нацыянальную бібліятэку. Дарэчы, яшчэ адзін атрымаў дырэктар Магілёўскага абласнога драмтэатра Андрэй Новікаў. Андрэй Масквін прысвяціў яму і форуму «М.@rt.кантакт» адзін з тамоў.

Цікавай падзеяй форуму стала лабараторная работа акцёра і рэжысёра Магілёўскага драмтэатра Уладзіміра Пятровіча «Час сэканд-хэнд» па аповесці беларускай пісьменніцы Святланы Алексіевіч. Дарэчы, гэтая пастаноўка асобна не была пазначана ў праграме форуму, але адбылася падчас яго. І выклікала зацікаўленасць з боку рэжысёраў, што прыехалі на фестываль.

Старшыня форуму, **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА** падкрэсліў, што адукацыйная роля фестывалю відавочная. Ён не толькі дае магчымасць убачыць усё тое новае, што адбываецца ў тэатральным мастацтве розных краін, але і служыць развіццю тэатральных традыцый у краіне. Нездарма ж яго падтрымлівае Міністэрства культуры. **Першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА** лічыць, што гэты форум робіць шмат для таго, каб аб'яднаць краіны. З распадам СССР, на жаль, многія кантакты былі страчаны.

Вядома, мастацтва патрабуе ахвяр, як жа без гэтага. І ахвяр дастаткова адчувальных. Юбілейны фестываль абышоўся больш чым у мільярд рублёў. Таму білеты на асобныя пастаноўкі каштавалі да 250 тысяч рублёў. Але зала не пуставала. Гэта лепш за ўсё іншае сведчыць: форум гораду патрэбны. І не толькі гораду, але і краіне. Менавіта фестываль у свой час пазнаёміў з п'есамі Дзіяны Балыкі, Паўла Пражко, Дзмітрыя Багаслаўскага, Міхаіла Рудкоўскага. Сёння гэтыя драматургі вядомыя ва ўсім свеце, і іх творчасць запатрабавана. «Праект і задумваўся як магчымасць стварыць цэнтр прыцягнення творчых сіл — маладых музыкантаў, мастакоў, артыстаў, драматургаў, — адзначыў Валерый Малашка. — І мне здаецца, што гэта атрымалася».

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара

■ Меркаванне

НЕ ВАРТА АДГАРОДЖВАЦЦА АД БІБЛІЯТЭКІ

У Брэсцкай абласной бібліятэцы праходзіць тыдзень дзіцячай кнігі. Скажаце, шараговае мерапрыемства, якое ладзіць амаль кожная буйная бібліятэка? І так, і не. Таму што брэсцкі тыдзень падаецца асаблівым.

Паводле слоў **дырэктара бібліятэкі Тамары ДАНІЛЮК**, незабыўнай стала сустрэча з пісьменнікам Анатолем Бутэвічам. Гэты чалавек так умее весці дыялог з юным чытачом, зацікавіць яго гістарычнай інфармацыяй, што вопытныя бібліятэчныя работнікі былі здзіўлены рэакцыяй прысутных. Малодшыя школьнікі засыпалі госця пытаннямі, а старэйшыя пэўны час сядзелі, што называецца, рот разявіўшы, спрабуючы пераварыць атрыманую інфармацыю, а потым паступова ўцягваліся ў дыскусію. Абыякавых у той аўдыторыі не было дакладна.

Цікавым атрымаўся дзень польскай кнігі. І не толькі незвычайным майстар-класам, які прывезлі калегі з Бяла-Падляскі: дзеці былі ў захапленні ад таго, што самі змаглі аформіць будучую кнігу. Школьнікі доўга не адпускалі генконсула Польшчы ў Брэсце Ганну Навакоўскую: давялося ёй успомніць усе школьныя гады, расказаць, якія прадметы любіла, якія кнігі чытала. «Дзеці праявілі цікавасць да кнігі, — сказала **намеснік дырэктара бібліятэкі Ала МЯСНЯНКІНА**, — выказалі інтарэс да гісторыі сваёй радзімы, гістарычнай тэматыкі наогул. Калі гэты парыў дарослым удасца падтрымаць, будзе проста цудоўна, значыць, недарма ладзіўся тыдзень дзіцячай кнігі».

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Адно з мерапрыемстваў абласной бібліятэкі.

Названы прыклад — адна з апошніх добрых спраў абласной бібліятэкі, якія праводзяцца тут гады і дзесяцігоддзі. Галоўнае багацце ўстановы, несумненна, яе фонд, які налічвае больш за 900 тысяч кніг. Сярод іх ёсць надзвычай рэдкія выданні. Такія, як набытая нядаўна з прыватнай калекцыі радзівілаўская Біблія, выдадзеная ў берасцейскай друкарні ў XVI стагоддзі. Вяртанне на радзіму старажытнага фаліянта, які з'яўляецца адным з гістарычных сімвалаў амаль 1000-гадовага Брэста, стала своеасаблівым лагічным працягам велізарнай навуковай работы, якую праводзіць бібліятэка. Яшчэ тры гады таму на адной з навукова-практычных канферэнцый асцярожна казалі пра магчымасць займець асобнік сапраўднай Біблії, надрукаванай на тэрыторыі цяперашняй крэпасці амаль 500 гадоў таму. Цяпер яна — частка фонду, якім можна заслужана ганарыцца.

На брэсцкіх канферэнцыях традыцыйна бываюць сур'ёзныя вучоныя з многіх краін свету. Менавіта навуковыя форумы даюць пачатак такім значным праектам, як віртуальныя рэканструкцыі кнігазбораў. Першай паспяховай ластаўкай названай справы стала рэканструкцыя бібліятэкі роду Сапегаў, якая некалі захоўвалася ў Ружанскім палацы, а цяпер раскідана па ўсім свеце. Калегі адгукнуліся на просьбы бібліятэкараў з Брэста, прадаставілі электронныя копіі 30 кніг, і пры падтрымцы бюро ЮНЕСКА ў Маскве выйшаў дыск «Віртуальная рэканструкцыя бібліятэкі роду Сапегаў». Для таго, хто мае навуковы, даследчы інтарэс у вывучэнні сапегіяны, лічбавая версія кніг — проста знаходка.

Сёння Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага мае не толькі дзясяткі тысяч чытачоў, якія наведваюць залы, але і сотні тысяч карыстальнікаў яе сайта. А вось 900 тысячам фаліянтаў цесна ў фондах, якія былі разлічаны ў свой час на 500 тысяч.

Будынак бібліятэкі ўзвялі без малога паўстагоддзя таму. І за гэты час ні разу не праводзіўся капітальны рамонт. Таму зразумела, што з часам паўстала пытанне не толькі аб рамонце, але і аб рэканструкцыі. Гаворка пра гэта вядзецца не адзін год, было прынята рашэнне аблвыканкама, але яго выкананне па розных прычынах зацягвалася. І цяпер ніхто не возьмецца сказаць, калі ж дойдзе чарга да бібліятэкі. Можа б, гэтае пытанне не паўставала так востра, каб не пабудавалі жылы дом паміж бібліятэкай і праезнай часткай бульвара Касманаўтаў.

На фоне гэтай абсурднай пасадкі дома асабліва робіцца прыкметна, як удумліва падыходзілі да справы архітэктары сярэдзіны мінулага стагоддзя! Яны аднеслі будынак бібліятэкі крышачку ўглыб вуліцы, каб не перабіваў дарожны шум цішыню чытальных залаў, і аддзялілі дом кнігі ад дарогі прыгожым скверам. Сучаснікі зруйнавалі той сквер і засунулі жылы дом з паркоўкамі на лапік зямлі. У ранейшыя часы такі падыход назвалі б ледзь не шкодніцтвам, а цяпер, відаць, называюць верхам рацыяналізму. Дом узводзіла сумна вядомая ў Брэсце фірма «Аблічча», дырэктар якой сёння адбывае тэрмін пакарання. Ды гэта так, да слова. Пачалася будоўля, як заўсёды, з забівання паляў. Вось гэта і стала момантам ісціны для старога будынка бібліятэкі. Трэшчыны, якія толькі намячаліся, а дзе-нідзе былі яшчэ нябачныя, зазеўралі і звонку, і знутры. Дзевяціпавярховы дом пачаў узводзіцца амаль дзесяць гадоў таму, і да гэтай пары, дарэчы, стаіць не скончаны. Але ён зусім закрыў з вуліцы бібліятэку.

Калі пра партызанскую паэзію я даведаўся ад маладога пакалення, то пра партызанскі хлеб лепш за ўсіх распавяла непасрэдная сведка яго выпечкі пенсіянерка Яўгенія Сярчэня. Яна добра памятае, як маці замешвала цеста, выпякала хлеб на кляновых лістах. Запасы мукі былі невялікія (ды і тыя хутка скончыліся), таму ў цеста дамешвалі бульбу. Соль дробкамі збіралі па хатах, часам замест яе гаспадыні выкарыстоўвалі звычайную салетру, якая засталася з мірных дзён. Што датычыцца лясной партызанскай хлебапякарні, то ...Жонка У.І. Леніна, Надзея Канстанцінаўна Крупская, расказваючы пра свайго мужа, асноўны сэнс думак вызначыла так: «Усё чалавечае было яму ўласціва». Простыя людзі ў першыя дні нападу Германіі не саромеліся прызнавацца ў разгубленасці. А якія пачуцці апаноўвалі кіраўнікоў — Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Берыю, Будзённага? З нядаўна рассакрэчаных матэрыялаў стала вядома аб спробе ўрада СССР (Л.П. Берыя), выкарыстоўваючы пасла Балгарыі ў СССР Стаменава, заключыць з Германіяй сепаратыўны мір. Узамен абяцалася аддаць Гітлеру Прыбалтыку, Украіну, Малдавію. Адбывалася гэта ў канцы чэрвеня 1941 г. У дакументе, надрукаваным у кнізе аднаго з кіраўнікоў знешняй разведкі СССР Паўла Судаплатава, іншая інфармацыя адсутнічае. Такім чынам, словы Крупскай адносяцца і да названых намі кіраўнікоў: вызначаюць іх стан і падкрэсліваюць высокі ўзровень небяспекі, якая навісла над СССР.

Напярэдадні вайны адбылася змена пакаленняў у кіруючых колах Чырвонай Арміі. Заўважылі гэта і немцы. Пасля аднаго з баёў на подступах да Масквы Гудэрыян запісаў: «Я даведаўся ад аднаго штабіста, што ўсёй абаронай Масквы кіраваў прадстаўнік савецкага генералітэта нехта Жукаў». Але пройдуць чатыры гады, і ўжо іншы вядомы военачальнік, камандуючы амерыканскімі войскамі Дуайт Эйзенхаўэр, запросіць Г.К. Жукава да сябе ў госці, у Злучаныя Штаты Амерыкі. Такім чынам, можна сказаць, што сапраўды ў радах Чырвонай Арміі, у складзе яе ваенных кіраўнікоў адбылася змена пакаленняў. Але гэта не можа разглядацца ў якасці прычыны паражэнняў. Іншая справа — змены былі вынікам палітычных рэпрэсій, з-за якіх загінуў намеснік наркама абароны СССР Тухачэўскі і яго паплечнікі. Такія кадравыя страты адбіваліся як на практычным становішчы спраў, так і на тэорыі.

Крыніцы паражэнняў хаваліся і ў тым, што Сталін аддаваў шмат сіл барацьбе з апазіцыяй, у незавершанасці рэфармавання ўзброеных сіл краіны. Гэта выкарыстаў Гітлер, які ўжо ў 1939 г. даў умоўны знак аб падрыхтоўцы вайны з СССР. Думку гэту па-свойму выказаў вядомы савецкі пісьменнік Ілья Эрэнбург: «Сталін не выкарыстаў два гады перадышкі для ўмацавання абароны. Аб гэтым мне казалі ваенныя і дыпламаты».

Літаратура, прысвечаная гісторыі Ленінградскай, Прыбалтыйскай, Беларускай, Кіеўскай, Адэскай прыгранічных ваенных акруг, дае магчымасць для больш праўдзівых расказаў пра тых, хто тут ваяваў.

Сцяпан Васільевіч Супрун. Скончыў ваенную школу пілотаў. З 1931 г. — лётчык-выпрабавальнік розных тыпаў самалётаў, у тым ліку «МІГ-3». Папрасіў у Сталіна дазволу стварыць спецыяльны полк з лётчыкаў-выпрабавальнікаў. Станоўчы адказ быў атрыманы, і ён адправіўся на фронт. 4 ліпеня 1941 г. уступіў у бой з шасцю фашысцкімі знішчальнікамі. Збіў аднаго, але загінуў і сам. 22.07.1941 г. С.П. Супрун пасмяротна ўзнагароджаны другім медалём «Залатая Зорка». Толькі праз 20 гадоў у Талачынскім раёне Віцебскай вобласці былі знойдзены астанкі героя...

Мікалай Францавіч Гастэла 26 чэрвеня 1941 г., вяртаючыся з баявога задання, трапіў пад абстрэл нямецкага самалёта. Ад прабітага бензабака пачаўся пажар. Становішча аказалася крытычным. Але Гастэла і экіпаж скіравалі самалёт у нямецкую калону аўтамашын. Імя Героя Савецкага Саюза М.Ф. Гастэлы (1941) унесена ў спіс 207-га далёкабамбардзіровачнага авіяпалка 42-й бамбардзіровачнай авіяцыйнай дывізіі.

У цэнтры антынямецкага супраціўлення стаялі палкі Заходняга фронту, размешчанага на тэрыторыі Беларусі. Гэта трэба мець на ўвазе тым гісторыкам, якія з пэўнай прыкрасцю называюць Заходні фронт самым крывавым фронтам Чырвонай Арміі. Дачка Сталіна, Святлана Алілуева, «узнагародзіла» яго нават словам «пекла».

Гейнц Вільгельм Гудэрыян: «14 чэрвеня Гітлер слухаў даклады камандуючых групамі армій аб іх гатоўнасці да нападу на Расію. Мяне запыталі толькі аб адным: праз колькі дзён я дасягну Мінска. Я адказаў: праз 5-6. 22 чэрвеня пачалося наша наступленне. А 27 чэрвеня я дасягнуў Мінска».

АЛЕ Заходні фронт, нягледзячы на цяжкія паражэнні летам 1941 г. (з 44 дывізій 24 былі разгромлены, страчана 1797 самалётаў), застаўся жыць. Стаў удзельнікам Маскоўскай бітвы. Яго камандуючымі былі: Паўлаў, Цімашэнка, Конеў, Жукаў, Сакалоўскі, Чарняхоўскі.

На 93-й старонцы трохтомніка «Усенародная барацьба Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны» напісана: *«Партыйныя агітатары з ліпеня па снежань 1941 г. казалі праўду аб гераічнай барацьбе Чырвонай Арміі, жыцці ў савецкім тыле»*. Але якая гэта была праўда, калі сапраўдную не заўсёды ведалі нават кіраўнікі Генеральнага штаба Чырвонай Арміі Жукаў, Шапашнікаў, Цімашэнка? Пералом у ход падзей, у тым ліку і інфармацыйных, унёс дзень 5 снежня 1941 г., з якім звязаны дзве гістарычныя падзеі: спыненне руху ворага ў маскоўскім кірунку і пераход Чырвонай Арміі ў контрнаступленне. Вось тады і пачаліся новыя старонкі ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. (У некаторых артыкулах сцвярджаецца аб падрыхтоўцы ў Мінску, у студзені 1942 г., нібыта ў гонар Маскоўскай бітвы, народнага паўстання. Але гэта не адпавядае рэальнасці. Гэта была нямецкая правакацыя, якая скончылася гібеллю соцень і тысяч людзей. Нават Вільгельм Кубэ ў гарадской управе назваў тую справу жорсткай акцыяй.)

Маскоўская бітва стала пачаткам новай эры ў гісторыі Другой сусветнай вайны ў цэлым. Але «штопар» як асаблівая пагроза ваенна-стратэгічнаму становішчу Беларусі спыніў сваё існаванне ў ліпені 1943 г., калі Чырвоная Армія нанесла немцам пад Курскам такі ўдар, пасля якога войскі СССР ні разу не станавіліся ў працяглую абарону аж да 9 мая 1945 г. Сваю ролю ў гэтым адыграла і рэйкавая вайна ў Беларусі, падрыхтаваная і праведзеная партызанамі і падпольшчыкамі нашай рэспублікі.

Яўген БАРАНОЎСКІ, кандыдат гістарычных навук.

④

НА ЗДЫМКАХ

1. У гісторыка-краязнаўчым музеі Сароцкай сярэдняй школы.

2. Пенсіянерка Яўгенія Сярчэня і сёння памятае рэцэпт партызанскага хлеба.

3. Паэт Сяргей Квіткевіч напісаў пра сваю Любаншчыну шмат, у тым ліку і песню «Вастраў Зыслаў» (музыка мясцовага кампазітара М. Шагава).

4. Наўсцяж дарогі на Зыслаў работнікі мясцовага лясгаса ўстанавілі такія прыкметныя камяні.

НА МЯЖЫ ІСНАВАННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У рэспубліцы выйшаў шэраг добрых кніг пра вайну 1939—1945 гг. Але ў іх мала гаворыцца аб правядзенні саюзным урадам знешняй палітыкі. Няма адказу на пытанні: чаму краіна з пункту гледжання знешняй палітыкі аказалася закладніцай фашысцкага рэйха? Чаму СССР не пабудаваў нармальных узаемаадносін з Польшчай, Чэхіяй, Францыяй, Англіяй, ЗША? Нельга ўсё перакладваць на Сталіна, бо калі Сталін зблізіўся падчас вайны з кіраўніцтвамі Англіі (Уінстан Чэрчыль), ЗША (Франклін Рузвельт), то ўсё атрымалася найлепшым чынам. А калі гэта да яго рабілі асобныя кіраўнікі ваенных праграм (авіяцыі, бранятанкавых войскаў, караблёў, сувязі і г.д.), то нярэдка СССР аказваўся ў ізаляцыі. Ці магла тут быць нейкая змова? На мой погляд, пытанне тут існуе.

Ролю доўгачаканых крыніц па гісторыі Маскоўскай бітвы маглі б адыграць успаміны Г.К. Жукава, К.К. Ракасоўскага, С.К. Цімашэнкі, Б.М. Шапашнікава, прадстаўнікоў нашай рэспублікі П.К. Панамарэнкі, Д.Р. Паўлава, П.М. Машэрава і іншых. Некаторыя з іх пакінулі мемуарныя творы. Але яны рыхтаваліся ў той час, калі для праўды не заўсёды знаходзілася месца. Калі аднойчы, у 1950-я гады, Георгію Жукаву паказалі адзін твор па гісторыі першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны, ён сказаў: «Гэта не тая гісторыя, якая была, а тая гісторыя, якая напісана».

Прычынай няшчасных выпадкаў быў не «чалавечы фактар» (лётны састаў), а буйныя завадскія недапрацоўкі. Такім чынам, намёк на няпростую будучыню Беларусі прагучаў яшчэ за тыдзень да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

ДВА чалавекі ў Беларусі персанальна адказвалі за баяздольнасць Беларускай ССР: камандуючы Беларускай (з 11.07.1940 г. — Заходняй) асобай ваеннай акругі, генерал арміі Д.Р. Паўлаў і першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, член шэрагу ваенных саветаў Беларускай (Заходняй) асобай ваеннай акругі П.К. Панамарэнка. Яны, дзякуючы сваім пасадам, былі часткаю тагачаснай палітычнай сістэмы і верна ёй служылі. Але іх лёсы розныя. Напярэдадні вялікіх падзей Д.Р. Паўлаў паклаў на стол П.К. Панамарэнкі дакументаваную даведку (37 стар.) аб выніках інспектарскай праверкі стану мабілізацыйнай і ваеннай падрыхтоўкі Беларускай рэспублікі. Паводле яе, пакідалі жадаць лепшага падрыхтоўка механікаў-вадзіцеляў танкаў, урачоў, узровень навыкаў штабных работнікаў, забяспечанасць войскаў сродкамі сувязі, уменне імі карыстацца, стан супрацьпаветранай абароны, узровень баяздольнасці 10-й арміі, якая знаходзілася ў Беластоцкім выступе, і іншае. У размешчаных у Беларусі 3, 4, 10, 13 арміях недахоп кадраў складаў у сярэднім 30-35 працэнтаў. На даведцы — рэзалюцыя Панамарэнкі: *«Цудоўны дакумент. Збіральнае абагульненне многіх пытанняў МАБ-падрыхтоўкі. Іх трэба разгледзець. Некаторыя пытанні паставіць на ўдакладненне з саюзным урадам. Падрыхтаваць па раздзелах і галінах на падставе гэтага дакумента з улікам усіх іншых пытанняў МАБ-падрыхтоўкі.* **Рашэнне 30.04.1941 г.»** (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь). Але ў Маскву, на імя Сталіна, П.К.Панамарэнка адправіў сваё бачанне сітуацыі, якое ўжо не было такім жорсткім, як гэта здавалася ўдзельніку баёў у Іспаніі, Герою Савецкага Саюза Д.Р. Паўлаву. (Калі б вярнуць з таго свету Панамарэнку і Паўлава, то, напэўна, Панцеляймон Кандратавіч папрасіў бы прабачэння ў калегі — з прычыны адчування сваёй віны ў паражэннях вайскоўцаў, якія каштавалі жыцця Д.Р. Паўлаву.)



Панцеляймон Кандратавіч Панамарэнка (1902-1984): «Толькі аўтарытэтны камандзір можа выхоўваць байцоў, развіваць у іх самавалоданне і прымусіць пераадолець страх і інстынкт самазахавання, можа не толькі заклікаць да стойкасці, але і прымусіць да стойкасці».

Партызан, падпольшчык — словы, якія нарадзіліся ў Беларусі падчас барацьбы з замежнай ваеннай інтэрвенцыяй адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэтых людзей акружалі вялікай павагай. Існавала нават грамадская арганізацыя, якая падтрымлівала іх матэрыяльна, брала ў іх успаміны, арганізоўвала сустрэчы з моладдзю. Адным з яе кіраўнікоў быў Лявонцій Яфімавіч Адзінцоў, які потым, падчас нямецкай акупацыі, стаў удзельнікам Мінскага антыфашысцкага падполля. (Пераемнікам арганізацыі ў нашы дні з'яўляецца Рэспубліканская камісія па справах былых партызанаў і падпольшчыкаў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.) Словы «партызан» і «падпольшчык» існавалі не толькі як памяць, але і як дзейны фактар. Гэта знайшло сваю матэрыялізацыю ў рашэнні стварыць — пад пратэктаратам НКУС СССР — партызанскіх атрадаў на выпадак захопу Беларусі замежнай дзяржавай. Але ж перад самым пачаткам вайны гэта дактрына была несправядліва прызнана варожай, нездаровай і кампраметуючай усю боегатоўнасць краіны. Амаль 70 працэнтаў людзей, якія прайшлі такую падрыхтоўку, былі арыштаваны, а многія з іх рэпрэсаваны.

Партызан, падпольшчык — словы, якія нарадзіліся ў Беларусі падчас барацьбы з замежнай ваеннай інтэрвенцыяй адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэтых людзей акружалі вялікай павагай. Існавала нават грамадская арганізацыя, якая падтрымлівала іх матэрыяльна, брала ў іх успаміны, арганізоўвала сустрэчы з моладдзю. Адным з яе кіраўнікоў быў Лявонцій Яфімавіч Адзінцоў, які потым, падчас нямецкай акупацыі, стаў удзельнікам Мінскага антыфашысцкага падполля. (Пераемнікам арганізацыі ў нашы дні з'яўляецца Рэспубліканская камісія па справах былых партызанаў і падпольшчыкаў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.) Словы «партызан» і «падпольшчык» існавалі не толькі як памяць, але і як дзейны фактар. Гэта знайшло сваю матэрыялізацыю ў рашэнні стварыць — пад пратэктаратам НКУС СССР — партызанскіх атрадаў на выпадак захопу Беларусі замежнай дзяржавай. Але ж перад самым пачаткам вайны гэта дактрына была несправядліва прызнана варожай, нездаровай і кампраметуючай усю боегатоўнасць краіны. Амаль 70 працэнтаў людзей, якія прайшлі такую падрыхтоўку, былі арыштаваны, а многія з іх рэпрэсаваны.

Немцы вядуць наступленне. У рове *(на заднім плане справа)* знаходзяцца нашы ваеннапалонныя.

■ Абмяркуем?

КАМП'ЮТАР — ТОЛЬКІ ІНСТРУМЕНТ,

ЯКІ НІКОЛІ НЕ ЗАМЕНІЦЬ МЫСЛЕННЕ ІНЖЫНЕРА

З вялікай цікавасцю прачытаў інтэрв'ю з новым міністрам адукацыі Міхаілам Анатольевічам Жураўковым. Нарэшце прагучалі цвярозыя погляды на выхаванне і дзейнасць інжынера, без якога сёння немагчымае развіццё ніводнай галіны народнай гаспадаркі, немагчымы навукова-тэхнічны прагрэс.

Вось ужо 42 гады я працую галоўным інжынерам аднаго з лепшых праектных інстытутаў краіны. Прайшоў шлях ад майстра-будаўніка да галоўнага інжынера будаўнічага ўпраўлення ў перыяд бурнага росту будаўніцтва, прамысловасці і гарадоў у 60—70-я гады мінулага стагоддзя. Часткова пад маім уплывам раслі шматлікія інжынерныя кадры, і таму я магу рабіць высновы наконт выхавання і падрыхтоўкі інжынераў.

Вясковую школу закончыў у 1958 годзе. Запомніўся эпізод на ўступных экзаменах у Беларускі політэхнічны інстытут — адзін з найлепшых політэхнічных інстытутаў на той час у СССР. Пасля «пяцёрак», атрыманых на першых іспытах, апошнім здаваў фізіку. Усё адказаў без праблем. І тады выкладчык, які прымаў экзамен, узяўся мяне распытваць, адкуль я, якую школу заканчваў, хто вучыў мяне фізіцы і г.д. Вось вам і прыклад, што такое асабісты кантакт замест сённяшняга безаблічнага выпадковага тэсціравання.

Мне тады было толькі 16 гадоў. У той жа час я як школьнік паступаў у рамках 20% ад агульнага прыёму, бо ў 1958 годзе быў выдадзены загад аб прыёме ў ВНУ 20% школьнікаў і 80% людзей з вытворчасці. Тады ў гэтым быў сэнс, бо, як высветлілася, гэтыя 80% ішлі ў ВНУ строга мэтанакіравана. Адзін з абітурыентаў паступаў трэці раз запар на адну і тую ж спецыяльнасць — «інжынер-будаўнік». І ўсё ж такі паступіў. На першым курсе ў інтэрнаце ў адным пакоі жылі 8 чалавек, з іх толькі я адзін — шаснаццацігадовы хлопец, а астатнія — дарослыя мужчыны. Сярод іх — два маракі, якія 4 гады адслужылі на флоце, два хлопцы, якія прайшлі службу ў войску, і трое — з заводаў.

Так, мне давялося ім дапамагаць на першых курсах. Але ўжо на трэцім-чацвёртым курсе палова з іх вучылася на павышаную стыпендыю. Трэба было бачыць, як яны «грызлі навуку» па начах. Хлопцы ведалі, што ім трэба. Яны прыйшлі ў ВНУ не па дыплом, а па веды і прафесію. І ніхто ёй ніколі не здрадзіў.

Суцэльная камп'ютарызацыя, акрамя карысці, прынесла вялікую шкоду развіццю асобы інжынера. Паколькі ўсе сёння, асабліва пры абмежаваных ведах у дакладных навуках, ідэалізуюць камп'ютар настолькі, што думаюць, што той сам вырашыць усё за інжынера.

Я з задавальненнем прыгадваю настаўнікаў тагачаснай школы. А якія выкладчыкі былі ў політэхнічным інстытуце! Усе! Гэта былі адданыя справе і нам, моладзі, людзі і спецыялісты.

Матэматыку немалады Бухвалаў выкладаў дакладна, даходліва і з любоўю. Ён нам заўсёды тлумачыў: гэта вы сустрэнеце ў сапрамаце, гэта вам будзе патрэбна ў будаўнічай механіцы і г.д. Між іншым, ён гаварыў студэнтам пра шпаргалкі так: «Пішыце шпаргалкі абавязкова. Калі вы напішыце іх самі, значыць, вы прапрацавалі ўвесь курс».

А дацэнт Хаюцін! Ён так бадзёра расказваў пра канструкцыі, што за дзве гадзіны ўвесь выпэцквауся крэйдай. Такому энтузіязму можна пазайздросціць! І гэта ён, І.Л. Хаюцін, мне, кругламу выдатніку (першаму па размеркаванні), паказаў дарогу ў жыцці — як пацвердзілася, абсалютна правільную. Ён мне сказаў: «Тваёй высокай тэарэтычнай падрыхтоўцы не хапае вытворчага досведу. Кафедра і аспірантура пачакаюць. І ты не глядзі на свае «пяцёркі». Толькі на будоўлю. Памацай гады тры ўсё сваімі пальцамі, потым у праектны інстытут гады на чатыры, і тады табе цаны не будзе». Гэта не мае, гэта яго словы. Дзякуй яму вялікі!

Вучоба ў БПІ была сур'ёзнай. Усе, за выключэннем некалькіх абібокаў, паспяхова авалодалі інжынернай падрыхтоўкай. Яшчэ адна адметнасць. Тады састаў студэнтаў БПІ быў амаль увесь мужчынскі, у групе з 30 чалавек у нас было не больш як 4-5 дзяўчат. Фемінізацыя (сёння ў БНТУ па калідоры бегаюць пераважна дзяўчаткі) інжынернай працы зусім не на карысць. Вырашаць найскладанейшыя, часта вельмі небяспечныя задачы на вытворчасці — гэта мужчынская справа. Паверце майму вялізнаму досведу будаўніка: для гэтага неабходна мець цудоўныя веды перш за ўсё па фізіцы, умець выстройваць строгую лагічную мадэль таго, што адбылося, падлічыць сёе-тое ў галаве і адразу даць рэкамендацыі.

«Калі хочаце стаць выдатным інжынерам, вы павінны ведаць фізіку лепш за свайго выкладчыка — каб інтуітыўна і імгненна ацаніць сітуацыю», — так я заўсёды кажу моладзі, якая прыходзіць да нас у інстытут.

Два гады таму на энергетычны факультэт БНТУ паступіў малады чалавек, які здаў тэст па фізіцы на «1». Але ён прайшоў па агульнай суме тэстаў. У інжынернай справе гэта недапушчальна!

Акрамя таго, аб'ект трэба не проста «сфатаграфаваць» позіркам, а бачыць усю яго сутнасць як зверху, так і ўнутры ў дэталях. Але, на жаль, нярэдка інжынеры вузкага профілю, нават з навуковымі ступенямі, аб'ект цалкам не ахопліваюць і робяць няправільныя высновы. Пры гэтым трэба яшчэ абавязкова мець добрае прасторавае ўяўленне. На жаль, не ўсе, у каго ёсць дыплом інжынера, яго маюць. Мала таго, яго трэба развіваць з дзіцячых гадоў. У той жа час хтосьці у Міністэрстве адукацыі здагадаўся дзясятак гадоў таму выключыць са школьнай праграмы чарчэнне. У стагоддзе тэхнічнага прагрэсу гэта сапраўднае шкодніцтва! Пасля, праўда, памылку зразумелі, і прадмет вярнулі.

Адзначу таксама, што суцэльная камп'ютарызацыя, акрамя карысці, прынесла вялікую шкоду развіццю асобы інжынера. Паколькі ўсе сёння, асабліва пры абмежаваных ведах у дакладных навуках, ідэалізуюць камп'ютар настолькі, што думаюць, што той сам вырашыць усё за інжынера. Але ж камп'ютар — толькі інструмент, які аблягчае яго працу. Ён жа ні-ко-лі не заменіць яго мысленне. А калі чалавек, не разумеючы сутнасці задачы, увядзе ў камп'ютар няправільную інфармацыю або разліковую схему, то вынік атрымае няправільны. І тады памылка прывядзе да аварыі!

Мой досвед сведчыць, што найпрасцейшыя фізічныя формулы, «азы» супраціўлення матэрыялаў, будаўнічай механікі кожны інжынер павінен усё жыццё памятаць і ў экстрэмальных выпадках неадкладна выкарыстоўваць гэтыя веды. Дарэчы, для простых падлікаў вельмі карысная лагарыфмічная лінейка, якую моладзь і ў вочы не бачыла.

Для далейшага прагрэсу ў падрыхтоўцы інжынерных кадраў хачу даць яшчэ некалькі рэкамендацый.

У школьныя праграмы матэматыкі і фізікі няма патрэбы ўключаць элементы вышэйшага ўніверсітэцкага курса (дыферэнцыялы, інтэгралы і інш.). Навошта гэта ў школе ўсім, калі з класа, напрыклад, выйдзе ўсяго толькі адзін інжынер або матэматык? У ВНУ ж усё гэта без праблем сістэмна вывучаецца студэнтамі з матэматычным мысленнем.

Настаўнікам фізікі і матэматыкі трэба падняць аплату працы, бо іх мысленне асабліва — гэта дар Божы. Тады яны пойдуць у школу.

Асобнае пытанне выклікае тэсціраванне пры паступленні ў ВНУ. Толькі гутарка зможа выявіць веды. І што значаць 15—20 балаў са 100? Хіба гэта веды? Да смешнага даходзіць, калі, напрыклад, два гады таму на энергетычны факультэт БНТУ паступіў малады чалавек, які здаў тэст па фізіцы на «1». Але ён прайшоў па агульнай суме тэстаў. У інжынернай справе гэта недапушчальна!

Хлопцаў трэба скіраваць у інжынерную сферу. Для гэтага неабходна выяўляць здольных ужо ў школе і арганізоўваць для іх спецыяльныя заняткі. Японцы гэта даўно зразумелі.

Званне інжынера трэба падняць на высокі ўзровень. Варта арганізаваць прапаганду інжынернай прафесіі ў СМІ, каб выклікаць у моладзі зацікаўленасць. Марудзіць далей не дапушчальна!

Рышард КАЦЫНЕЛЬ, галоўны інжынер інстытута «Гроднаграмадзянпраект»

■

Краіна здароўя

Выпуск № 6 (336)

■ Доктар адкажа

НІ САГНУЦЬ, НІ РАЗАГНУЦЬ

«Раскажыце, калі ласка, пра гонартроз. Якім можа быць лячэнне, акрамя абязбольвання?

Ірына Фёдараўна, *Мінская вобласць».*

Тлумачыць урач-рэўматолаг 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Алена СІДАРОВІЧ:

— Самым распаўсюджаным захворваннем суставаў з'яўляецца астэаартроз. Яго рэнтгеналагічныя прыкметы выяўляюцца больш чым у 85 працэнтаў людзей ва ўзросце пасля 60-ці, а клінічныя праявы — прыкладна ў 12 працэнтаў.

Большасць суставаў у нашым арганізме складаецца з канцавых участкаў дзвюх касцей, пакрытых тонкім слоем храстка. Пры астэаартрозе храсток пакутуе. Яго паверхня становіцца грубаватай, у ёй могуць з'явіцца невялікія разрывы. Косць пад храстком становіцца таўсцейшай, чым звычайна, і пачынае разрастацца па баках сустава, што можа прывесці да абмежавання руху сустава, а ў цяжкіх выпадках — і да дэфармацыі. Часам працэс суправаджаецца запаленнем, таму сустаў можа прыпухаць, але ў цэлым запаленне нехарактэрнае для астэаартрозу.

Ад астэаартрозу могуць цярпець любыя суставы. Гонартроз — гэта астэаартроз каленнага сустава. Балючыя адчуванні ў каленях звязаны з дыстрафічнымі зменамі ў храстку, які пакрывае ўнутрысустаўныя паверхні касцей.

Што спрыяе развіццю захворвання?

Спадчынная схільнасць, парушэнне абмену рэчываў (захворванне часцей развіваецца ў людзей з лішняй вагой, атлусценнем), узрост (захворванне можа развіцца і ў маладых, але найбольшая колькасць прыпадае на ўзрост 60-65 гадоў), прыроджаныя або набытыя дэфекты будовы апорна-рухальнага апарату (скаліёз пазваночніка, дысплазія суставаў, плоскаступнёвасць), павышаная рухавасць сустава, цяжкія фізічныя нагрузкі, заняткі спортам, якія прыводзяць да хранічных мікратраўмаў храстка, траўма сустава, перанесеная аперацыя на суставах, зніжэнне ўзроўню жаночых палавых гармонаў.

Як праяўляецца?

Болем і «скаванасцю» ў суставе. Спачатку пры працяглай хадзе, раніцай пры ўставанні з ложка, пасля працяглага знаходжання ў становішчы сядзячы. Паступова боль узмацняецца і становіцца больш упартым, працяглым. Часцей адчуваецца з унутранага боку сустава. Палёгка наступае ў становішчы лежачы, але на позніх стадыях боль не адпускае нават ноччу. Паступова ўсё цяжэй становіцца сагнуць і разагнуць нагу, з'яўляецца хруст, ацёк, дэфармацыя, урэзшце — кульганне. У запушчаных, нялечаных выпадках можна перасоўвацца толькі з дапамогай мыліц.

Якім будзе абследаванне?

Дыягназ ставіцца на падставе клінічных сімптомаў. Для вызначэння ступені пашкоджання прызначаюць агульны і біяхімічны аналіз крыві, рэнтгеналагічнае і ўльтрагукавое даследаванне суставаў.

Медыкаментознае лячэнне. Абязбольвальныя і супрацьзапаленчыя прэпараты, хондрапратэктары (спрыяюць аднаўленню храстковай тканкі). Гэта могуць быць таблеткі, унутрымышачныя і ўнутрысустаўныя ін'екцыі, гелі, мазі, крэмы.

Артапедычнае лячэнне. Прымяненне спецыяльных прыстасаванняў, якія змяншаюць нагрузку на сустаў: артэзы (накаленнікі, якія абмяжоўваюць рух у суставе), артапедычныя вусцілкі, кій. Падборам займаецца ўрач-артапед. Пры пашкоджанні суставаў ніжніх канечнасцяў вялікае значэнне мае падбор абутку з аптымальнай вышынёй абцаса 2-4 см.

Хірургічнае лячэнне. Эндапратэзаванне — замена сустава або яго частак на штучныя.

Дадатковае лячэнне. Масаж, мануальная тэрапія, іголкарэфлексатэрапія, лячэнне лазерам. Цеплавыя працэдуры з парафінам, азакерытам, лячэбнай граззю. Крыятэрапія — мясцовае лячэнне холадам. Магнітатэрапія.

Лячэбная гімнастыка. Без комплексу лячэбных практыкаванняў, падабраных індывідуальна, немагчыма дасягнуць умацавання мышцаў, якія акаляюць хворы сустаў, палепшыць яго кровазварот і сілкаванне тканак. Практыкаванні праводзяцца на падлозе, лежачы і седзячы. Працягласць ад 10 хвілін (напачатку) да 30 хвілін. Выконваць практыкаванні трэба асцярожна, плаўна, без адчування болю. Супрацьпаказаны прысяданні, згінанне-разгінанне, працяглая хада, любыя рухі, якія выклікаюць боль.

Лішняй вагі трэба пазбаўляцца. Дыета павінна быць збалансаванай. Бялкі (жывёльныя — рыба, нятлустае мяса, тварог, сыры і іншыя малочныя прадукты, раслінныя — фасоля, грэчка, сачавіца) неабходныя для аднаўлення храстка. Гатаваць гэта трэба на пары або варыць, тушыць. Вугляводы — у выглядзе садавіны і гародніны. Тлушчы — пераважна алей, масла абмежавана. Неабходна дастатковая колькасць вітамінаў групы В — B_1 у бульбе, бабовых; B_2 — у яйках, малочных прадуктах, бананах; B_6 — мясе курыцы, арэхах; B_{12} — капусце, сачавіцы. Алкаголь пад забаронай па прычыне свайго агульнага шкоднага ўплыву на арганізм.

Як не дапусціць?

Беражыце правільную постаць з дзяцінства.

Рэгулярна займайцеся фізкультурай, плаваннем для ўмацавання мышачна-звязкавага апарату.

Любыя парушэнні мышачна-касцявой сістэмы карэкціруйце як мага раней.

Спадчынную схільнасць улічвайце пры выбары прафесіі і віду спорту.

Не перагружайце суставы — любую фізічную актыўнасць чаргуйце з адпачынкам

■ Здаровае харчаванне

ЁСЦЬ НАТУРАЛЬНАЕ — БУДЗЕ І АРГАНІЧНАЕ

Нездаровае харчаванне звязана з чатырма з дзесяці асноўных прычын смерці — лішняя вага і атлусценне, высокі крывяны ціск, высокі ўзровень глюкозы ў крыві і высокі ўзровень халестэрыну. «Цана атлусцення» для свету — 2 трыльёны долараў у год. Уздзеянне дрэннага харчавання на здароўе перавысіла ўздзеянне курэння.

— Усе спажыўцы заслугоўваюць права не толькі на ежу, але і на здаровае харчаванне, — кажа **намеснік міністра гандлю Рэспублікі Беларусь Ірына НАРКЕВІЧ.** — Вялікая ўвага цяпер надаецца тэме правоў спажыўцоў на здаровае харчаванне. Наогул, у заканадаўстве нашай і іншых краін адсутнічае паняцце здаровага харчавання. Міністэрства аховы здароўя Беларусі прапануе нам разумець пад гэтым тэрмінам харчаванне рацыянальнае, збалансаванае, разнастайнае (пры гэтым якаснае і бяспечнае), здольнае задаволіць фізіялагічныя патрэбы...

Мнагавата ці малавата

Прадукт	Норма (у год у кг на 1 чалавека)	Спажыванне
цукар	38	42
мяса і мясапрадукты	70	91
бульба і бульбапрадукты	129	179
алеі	11,7	17,7
малочныя прадукты	354	260
рыба і рыбапрадукты	23	15
фрукты	98,6	69

Што можна аднесці да здаровых прадуктаў і здаровага харчавання?

1. Прадукты, якія спрыяюць прафілактыцы захворванняў і ўмацаванню здароўя.

2. Дыетычнае і прафілактычнае харчаванне.

3. Прадукцыя, прамаркіраваная значком «Натуральны прадукт».

Гэта прадукты, вырабленыя з натуральнай сыравіны жывёльнага, раслінnага, мінеральнага (соль, вада і інш.) паходжання, без прымянення метадаў геннай інжынерыі і штучных харчовых дабавак, без антыбіётыкаў, стымулятараў адкорму, гарманальных прэпаратаў, пестыцыдаў.

Сертыфікаты, якія пацвярджаюць выкананне ўстаноўленых патрабаванняў і служаць падставай для нанясення знака «Натуральны прадукт», атрымалі 48 прадпрыемстваў амаль для 300 найменняў прадукцыі. Знак «Натуральны прадукт» можна сустрэць на малочнай прадукцыі (кефір, малако, вяршкі, тварог, масла, смятана, біфідапрадукты), вадзе, соках, кансерваваным гароху, мясных паўфабрыкатах, солі, шакаладзе і г.д. З поўным пералікам прадуктаў і іх вытворцамі можна азнаёміцца на сайце gosstandart.gov.by у тэматычным раздзеле.

Развіццё ў краіне праекта «Натуральны прадукт» разглядаецца як этап пераходу на маркіроўку «Арганічныя харчовыя прадукты», вытворчасць якіх улічвае экалагічныя крытэрыі ўсяго ланцуга жыццёвага цыклу прадукцыі. Пакуль адпаведнай прававой базы, як у Еўропе, няма, таму можна пакаштаваць толькі імпартную «арганіку».

4. Прадукты з нізкай колькасцю цукру, солі, транс-тлушчаў і харчовых дабавак — таксама не развіты ў краіне кірунак.

5. Нізкакаларыйныя прадукты кшталту бяздрожджавага хлеба, хлебцаў, мюслі, вотруб'я, шматкоў, льнянога алею, малочных вырабаў з паніжанай тлустасцю.

6. У асартыменце харчовых магазінаў абавязкова павінны быць цэльнамалочныя прадукты з тлушчам не больш за 2,5%, рыба жывая, хлебцы, шматкі зерневыя, ёдаваная соль, фітачаі, плодагароднінная прадукцыя. У перспектыве гэты пералік папоўніць і бяздрожджавы хлеб.

7. Звыш 20 плодаагароднінных культур пастаўляюцца на прылаўкі круглы год

У сталовых...

Гарачае харчаванне прапануецца сёння ў 85-100 працэнтах школ у залежнасці ад рэгіёна. Кожная пятая сталовая робіць заказ страў для меню заўтрашняга дня. Некаторыя працуюць па тыпе шведскага стала, у іншых — комплексныя абеды. Школьнікам абавязкова прапануюць ёгурты, сыркі тварожныя, малако, сокі, джэмы і масла. «Кока-Колы» і сасісак у цесце даўно няма. Харчаваннем ахоплены да 80 працэнтаў вучняў.

Калі на вытворчых прадпрыемствах ёсць работнікі, якім рэкамендавана дыетычнае харчаванне, значыць, ім абавязаны прыгатаваць у сталовай менавіта такія стравы.

...і кавярнях

Майце на ўвазе, што ў тэхналагічнай карце любой установы грамадскага харчавання заўсёды ёсць інфармацыя пра каларыйнасць кожнай стравы — і мяса па-французску, і марожанага. Даступныя спажыўцу (калі яму цікава) і звесткі аб прадуктах, з якіх прыгатавана заказаная страва.

Куплялі больш...

Летась у параўнанні з папярэднім годам продаж фруктаў вырас прыкладна на 20 працэнтаў, гародніны — на 8,5, мясапрадуктаў — на 5,5, рыбы і морапрадуктаў — на 7,5, сыру — на 2, алеяў — на 7, круп — на 4,5.

...і менш

Продаж тытунёвых вырабаў знізіўся на 9,5 працэнта, алкагольных напояў — на 7, прычым продаж вінаградных він, каньяку і каньячных напояў, а таксама слабаалкагольных напояў крыху вырас, а гарэлкі, лікёраў, ігрыстых він і шампанскага, пладовых він і піва крыху ўпаў.

■ Ці ведаеце вы, што...

А ЁН ТАКІ ЎСТОЙЛІВЫ

На дыспансерным уліку ў Беларусі — звыш 7 тысяч пацыентаў з туберкулёзам. Абсалютная большасць — людзі працаздольнага ўзросту. Частка з іх знаходзіцца на стацыянарным лячэнні, іншыя пераведзены ўжо на амбулаторнае. Гэты другі этап не такі просты, як можа падацца. Як толькі пацыент пераходзіць на амбулаторны, самастойны прыём, ён павінен штодня наведваць арганізацыю аховы здароўя, каб атрымліваць і прымаць лекі. У выпадку, напрыклад, мультырэзістэнтнага туберкулёзу гэта можа доўжыцца да 2 гадоў. Дастаткова прапусціць прыём лекаў хоць бы на адзін дзень, як шлях да выздараўлення падаўжаецца яшчэ на два гады. Калі пацыент вытрымлівае ўсе рэкамендацыі ўрача, то яму прапануюцца ў якасці своеасаблівага стымулу да працягу лячэння прадуктовыя наборы, а таксама аплата праезду.

Паводле слоў **начальніка аддзела першаснай медыка-санітарнай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людмілы ЖЫЛЕВІЧ**, звычайны туберкулёз можа перайсці ў мультырэзістэнтны пры няправільным лячэнні, перарыванні схемы прыёму прэпаратаў. Антыбіётыкі заўсёды трэба прымаць, як прызначыў урач, «да канца», нават калі самаадчуванне палепшылася. Гэта робіцца для таго, каб арганізм не пазбавіўся здольнасці супраціўляцца інфекцыі ў будучыні. Тыя ж правілы дзейнічаюць пры лячэнні туберкулёзу. Пацыенты часта не трымаюцца лячэння, і ў выніку набываюць устойлівыя да ўсіх схем тэрапіі мультырэзістэнтныя формы. А частка хворых першапачаткова інфіцыруецца ўстойлівымі да лячэння формамі і вымушаны адразу прымаць больш агрэсіўныя прэпараты.

Дзевяць з дзесяці пацыентаў з множнай лекавай устойлівасцю і тры з чатырох з мультырэзістэнтным туберкулёзам вылечваюцца ў выніку эфектыўна праведзенага лячэння.

Узровень захваральнасці і смяротнасці ў нас пакрысе зніжаецца, аднак Беларусь па-ранейшаму адносіцца да прыярытэтных краін Еўрапейскага рэгіёна САА3 (усяго 18 такіх краін — у тым ліку Азербайджан, Арменія, Балгарыя, Грузія, Казахстан і інш.) з высокай распаўсюджанасцю туберкулёзу і выпадкаў множнай лекавай устойлівасці. З 2007 года Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй выдаткаваў у межах грантаў звыш 35 млн долараў на ўкараненне ў нашай краіне хуткіх метадаў дыягностыкі і мер інфекцыйнага кантролю, на павышэнне прыхільнасці пацыентаў да лячэння.

«Беларусь можа атрымаць наступны грант Глабальнага фонду ў памеры 12 млн долараў на 2016-18 гады, — адзначае **намеснік пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі Кацярына ПАНІКЛОВА.** — Грошы мяркуецца патраціць на больш шырокае ўкараненне хуткіх малекулярна-генетычных метадаў дыягностыкі, набыццё супрацьтуберкулёзных прэпаратаў і прымяненне новых метадаў фінансавання амбулаторнага лячэння».

Дарэчы, летась у Магілёўскай вобласці для павышэння матывацыі найперш медработнікаў паспрабавалі аптымізаваць амбулаторнае лячэнне хворых на туберкулёз. Фінансавыя сродкі перанакіравалі са стацыянарнай дапамогі на амбулаторны ўзровень. Медработнікі, якія кантралююць лячэнне, атрымлівалі дзякуючы гэтаму даплату. Сёлета эксперымент будзе пашыраны на ўсе вобласці.

Як вядома, палачкай Коха інфіцыраваныя амаль усе дарослыя. Аднак яна застаецца ў арганізме ў «замарожаным» стане. Захварэць чалавек можа пры пэўных умовах. Адна з іх — аслаблены імунітэт. Зразумела, што ў першую чаргу гэта людзі з ВІЧ. Кожны ВІЧ-інфіцыраваны мае больш як у сто разоў вышэйшую верагоднасць захварэць на туберкулёз, у тым ліку мультырэзістэнтны. Існуюць і іншыя фактары, здольныя аслабляць імунную сістэму — гарманальная тэрапія, дэфіцыт масы цела, недаяданне, стрэсы. Наогул у туберкулёзу — свае групы рызыкі. Адна — сацыяльная, другая — медыцынская. У першай — бяздомныя, нарказалежныя і інш., у другой — тыя, хто ігнаруе своечасовае абследаванне.

*Цягам наступных 20 гадоў ставіцца задача знізіць смяротнасць ад туберкулёзу на 95 працэнтаў і захваральнасць наблізіць да ўзроўню 10 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва (пакуль у краіне 50 на 100 тысяч).

*Нават калі ў хворага была інфекцыйна небяспечная форма захворвання, літаральна праз месяц пасля пачатку лячэння ён цалкам бяспечны для навакольных. Палова хворых на туберкулёз не ўяўляе ніякай інфекцыйнай пагрозы, паколькі ў іх не выдзяляецца палачка Коха.

*У месцах зняволення захваральнасць зараз прыкладна ў 4 разы вышэйшая ў параўнанні з астатняй часткай грамадства. Праблема прыхільнасці да лячэння ў пенітэнцыярнай сістэме яшчэ больш вострая (хворыя зняволеныя атрымліваюць пэўнае паслабленне рэжыму). Праўда, Міністэрства аховы здароўя прапануе ўжо не разглядаць туберкулёз у якасці падставы для датэрміновага вызвалення хаця б таму, што ў пенітэнцыярнай сістэме створаны ўсе ўмовы для паўнацэннага лячэння

■ Жыць незалежным

ВЫПІ ЧАЮ, ЗАВЯЖЫ З НАРКОТЫКАМ

Цэнтр падтрымкі людзей, якіх закранула праблема наркаманіі, адкрыўся ў Мінску ў межах праекта ПРААН (гранта Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй) на базе арганізацыі «Пазітыўны рух». Цэнтр гатовы прыняць першых наведвальнікаў, якія могуць разлічваць на кансультацыю юрыста, псіхолага, хірурга, нарколага, фтызіятра, інфекцыяніста, гінеколага, сацыяльнага работніка. Акрамя таго, тут можна прайсці тэст на гепатыт і ВІЧ. Паслугі прадастаўляюцца ананімна і бясплатна.

Паводле слоў каардынатара цэнтра Вячаслава САМАРЫНА, тут нікому нічога не будуць навязваць, галоўнае — сама магчымасць падтрымліваць стасункі, бо многія нарказалежныя проста адзінокія або ў іх акружэнні няма тых, з кім можна было б пагаварыць аб сваім жаданні пачаць новае жыццё, адмовіцца ад наркотыку. Адсюль і дэвіз цэнтра: «Мы прымаем людзей такімі, якія яны ёсць, і падтрымліваем поўную адмову ад ужывання наркотыкаў». Такая «дроп-ін» зона (ад англ. «свабодна зайсці» або «зайсці на агеньчык») прапануе наведвальніку камфорт, знаходжанне ў спакойнай атмасферы, дзе можна папіць чаю, паглядзець відэа, а праз нейкі час тут можна будзе нават памыць і пасушыць сваё адзенне.

Для захавання ананімнасці наведвальнікі будуць запісвацца кожны пад уласным кодам, а пры паўторным наведванні проста пазначаць код у часопісе, — і больш ніякіх дакументаў.

Цэнтр размяшчаецца ў Мінску па адрасе: вул. Матусевіча, 23-107. Час працы: з 12.00 да 20.00. Гэта памяшканне на першым паверсе з асобным уваходам. Работа цэнтра афіцыйна ўзгоднена з міліцыяй, дзе цудоўна ведаюць, што размова ідзе пра самы неспрыяльны раён па наркаспажыванні і што тут патрабуюцца прынцыпова новыя метады прафілактыкі.

Падобныя паслугі ўжо некалькі гадоў прапануюцца ва Украіне, Польшчы, Даніі, Германіі

■ Сексуальны лікбез

МАГУ... АЛЕ НЕ ХАЧУ!

Вось так нярэдка і бывае ў жанчын. У моцнага полу з гэтым прасцей...

Тое, што мы кахаем сэрцам, — проста прыгожыя словы. Пачуцці, а разам з імі і жаданні, зараджаюцца ў галаўным мозгу. Так што мы, хутчэй, кахаем гіпаталамусам і гіпофізам! На некалькі простых, але цікавых пытанняў адносна сексуальнага жыцця «пралівае святло» ўрач-псіхатэрапеўт-сексолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Васіль ШАЎЛЯКОЎ.

— Як узнікае сексуальнае жаданне?

— Сексуальнае жаданне складаецца з двух кампанентаў. Усвядомленае жаданне кіруецца карой галаўнога мозга, залежыць ад нашай свядомасці і многіх свядомых псіхічных з'яў, у аснове якіх хаваецца мысленне і ўспрыманне, і з'яўляецца вышэйшай псіхічнай функцыяй чалавека. Неўсвядомленае жаданне кіруецца і кантралюецца пераважна гарманальна. Спачатку эндакрынная сістэма павінна атрымаць ад мозга сігнал, каб запусціць выпрацоўку гармонаў. Адказваюць за гэтыя сігналы самыя старажытныя часткі мозга — гіпофіз і гіпаталамус. Эксперыменты шведскіх нейрапсіхолагаў паказалі, што гіпаталамус па-рознаму рэагуе на ферамоны (рэчывы, якія выклікаюць узбуджэнне) у людзей з рознай сексуальнай арыентацыяй. У геяў ён адчувальны да мужчынскіх ферамонаў, як і гіпаталамус жанчын. У мужчын-гетэрасексуалаў ён не праяўляе ніякай цікавасці да мужчынскіх ферамонаў, але адгукаецца на жаночыя. Так што з пункту гледжання біялогіі сексуальнае жаданне ўзнікае па біялагічных законах і не залежыць ад нашай волі. Што да гармонаў, то шлях да сексу пачынаецца з дафаміну: ён адказвае за ўзбуджэнне і за тое, што мы, ахопленыя жаданнем, страчваем кантроль над сабой — ідзём на рызыку, імпульсіўныя ўчынкі.

— Чым жаночае жаданне адрозніваецца ад мужчынскага?

— З сексуальным жаданнем у жанчын усё складаней, чым у мужчын. Проста таму, што для мужчын узбуджэнне і жаданне — амаль сінонімы, а для жанчын не заўсёды. Мужчынскае жаданне ў многім абумоўленае фізіялогіяй, а жаночае па сваёй прыродзе псіхалагічнае.

Не так даўно канадская даследчыца-сексолаг прааналізавала вынікі 132 даследаванняў, якія вымяралі ўзровень узбуджэння мужчын і жанчын падчас прагляду эратычнага відэа. Высветлілася, што ў мужчын жаданне і ўзбуджэнне цудоўна стасуюцца паміж сабой. А ў жанчын гэта ўзаемасувязь амаль не праглядалася.

Гэта адна з прычын, па якіх для жанчын так і не прыдумалі надзейнага «любоўнага напою» ці віягры. Прыліў крыві да палавых органаў, вядома, прыводзіць іх у стан узбуджэння. Вось толькі ніякага жадання пры гэтым жанчына можа не адчуваць.

Доўгі час лічылася, што для жанчын важныя ў першую чаргу стасункі. Менавіта яны, надзейныя і гарманічныя, нараджаюць сексуальнае жаданне. Аднак шэраг сучасных даследчыкаў скептычна ставяцца да такога пункту гледжання. Верагодна, на пачатковым этапе стасункі даволі моцна ўзбуджаюць жанчыну. Аднак ці надоўга захоўваецца такое становішча? Можа быць, для многіх жанчын больш важна мець добрыя стасункі, а не добры секс. Але адсюль не вынікае, што стасункі сексуальна ўзбуджаюць жанчыну. Калі б стабільнасць, камфорт і ўзаемная павага сапраўды так моцна стымулявалі жаночае лібіда, мы б наўрад ці бачылі столькі жанчын у паспяховым шлюбе са скаргамі на адсутнасць сексуальнага жадання.

— Па якіх прычынах жаданне можа знікаць?

— Мы ведаем, што сексуальнае жаданне — гэта прадукт зладжанай работы розных функцыянальных сістэм нашай фізіялогіі пад жорсткім уплывам псіхічнай дзейнасці шляхам адэкватнага функцыянавання цэнтральнай і перыферычнай нервовай сістэмы. Зрывы ў рабоце на кожным этапе складанага шматфункцыянальнага комплексу па-рознаму адбіваюцца на лібіда: ад яго зніжэння да поўнага знікнення.

Найбольш частымі прычынамі зніжэння лібіда з'яўляюцца псіхалагічныя праблемы і знясіленне функцыянальных магчымасцяў арганізма: пастаянны стрэс, прафесійнае і творчае выгаранне, дрэнныя стасункі з партнёрам (згасанне сексуальнага жадання ў пары часта з'яўляецца «намёкам» на наяўнасць праблем у стасунках, асабліва калі гэтыя праблемы настойліва ігнаруюцца і не ўсведамляюцца), аднастайнасць сексуальнага жыцця, заніжаная самаацэнка і незадаволенасць сабой (псіхалагічныя комплексы, унутрыасабовы канфлікт, у тым ліку пасля цяжарнасці і родаў, на фоне цяжкіх саматычных захворванняў, вытрымлівання розных дыет, прыёму супрацьзачаткавых і медыкаментозных гарманальных прэпаратаў) і г.д.

Сярод прычын іншага кшталту можна назваць змяненні гарманальнага фону ў выніку эндакрынных і гінекалагічных захворванняў, сексуальныя дысфункцыі (эрэктыльная дысфункцыя, анаргазмія, хваравітыя адчуванні пры сексуальным кантакце) і псіхічныя захворванні (трывожныя і дэпрэсіўныя расстройствы)

ШТО ХАВАЕЦЦА ЗА ГАРАЧЫМ «ХАЧУ»

— «Быць як усе», належаць да якой-небудзь групы — адна з асноўных нашых патрэб. І калі грамадства ўхваляе сексуальнасць і яе праявы, мы, хутчэй за ўсё, будзем імкнуцца стаць сексуальнымі. Так што, калі мы думаем, што жадаем сексу, мы, можа быць, жадаем чагосьці іншага, напрыклад, падтрымання іміджу, прызнання, поспеху... Сёння не толькі мужчыны хваляцца колькасцю палюбоўніц, але і жанчыны імкнуцца «калекцыянаваць» мужчын. Ёсць жанчыны, якія займаюць вялікія пасады, яны рашучыя і элегантныя, самаўпэўненыя і падцягнутыя... Вобраз начальніцы і сексуальнай жанчыны-вамп на многіх пунктах супадае.

Другі момант — уцёкі ад адзіноты. Мы бяжым ад яе, пакутуем ад душэўнай пустэчы, шукаем іншага чалавека, каб ён пазбавіў нас гэтага. Многія жанчыны, напрыклад, прыслухоўваюцца да сябе і чуюць унутраны голас: «Ах, прыціскай мяне да сябе, дазволь забыцца на адзіноту». У сэнсе, я такая слабая, мяне палохае гэта слабасць, але я гатова рызыкнуць. Нават калі ты мяне «зломіш», гэта лепш, чым згубіцца ў гэтым свеце... Аднак якім чынам прыцягнуць іншага чалавека? Прыманіць яго да сябе? Секс — адзін з самых хуткіх спосабаў дасягнуць блізкасці. Няхай ілюзорнай, але заўсёды жаданай. Насамрэч шмат гадоў сяброўскіх размоў павінны прайсці, каб мы дасягнулі з іншым чалавекам той натуральнай інтымнасці, якая, як мы думаем, сама сабой усталёўваецца раніцай пасля ложку. Вядома, тут можна прамахнуцца. Аднак калі ёсць сімпатыя, то ёсць і шанц пазнаёміцца бліжэй. Праведзеная разам ноч — толькі нагода для знаёмства.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ

по продаже производственного здания

с инв. №600/С-142795, расположенного по адресу: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Линейная, 1Б и принадлежащего СООО «Ферейн» (Продавец).

Земельный участок площадью 0,7300 га с кадастровым номером 623681702601002177 (право постоянного пользования). Целевое назначение – земельный участок для обслуживания и эксплуатации объектов, входящих в состав имущественного комплекса. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена с НДС – 3 321 600 000 бел. руб.
Задаток с НДС – 332 160 000 бел. руб.

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества СООО «Ферейн», **проводимом 13 апреля 2015 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **13.04.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.04.2015 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.08.2014.

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1270907, 1250153, 1250172, 1261138, 1290680, 1290770, 1299808, 1299880, 1299894, 1199566, 1324334, 1201058-1201061, 1201063. УНП 100782388

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ № 1. Одноэтажный бревенчатый жилой дом, общей площадью 50,2 кв.м с земельным участком площадью 0,2500 га с кадастровым № 22088702460100014, стоимостью 372 960 000 рублей**
Собственник (владелец) имущества	Лютько Николай Николаевич
Местонахождение (адрес) имущества	д. Красногорка Браславского района
Информация об обременениях	Земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0,0106 га. Земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов, площадью 0,2500 га
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 8, каб. 15 20 апреля 2015 года в 10.00
Справочная информация	Отдел принудительного исполнения Браславского района 211970, Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 8. Начальник отдела – Чернявский Иван Никодимович, тел. 80213562585
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Браславского района № 3642903000074 в РКЦ №205 в г. Браслав филиала №214 в г. Новополоцк ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801660, УНП 300002505, не позднее 16.00 17.04.2015 г. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии со ст. 486 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

УНП 100122846

ОАО «Белхим»

сообщает о решении общего открытого собрания акционеров О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ЗА 2014 ГОД:

• Период выплаты до 01.05.2015 года; на одну акцию 13 034,744 рубля.

• Порядок выплаты дивидендов – путем зачисления на лицевые счета акционеров.

На 2015 год установить распределение прибыли, остающейся в распоряжении ОАО «Белхим», за 2015 год и первый квартал 2016 года:

• на дивиденды – 5% от прибыли, остающейся в распоряжении Общества, периодичность выплаты дивидендов – за 1 полугодие 2015 г. и за 2 полугодие 2015 г.

• Установить сроки выплаты дивидендов: за 1 полугодие 2015 г. – не позднее 25.08.2015 г., за 2 полугодие 2015 г. – по решению очередного общего собрания акционеров по итогам работы за 2015 год.

ОАО «ИЗМЕРИТЕЛЬ»

Учетный номер плательщика: 300044189
Вид экономической деятельности: Производство электрораспределительной и регулирующей аппаратуры
Организационно-правовая форма: ОАО
Орган управления:
ОАО «Управляющая компания холдинга «Горизонт»
Единица измерения: млн.руб.
Адрес: г. Новополоцк, ул. Молодежная, 166

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	104 485	127 743
Нематериальные активы	120	101	132
Доходные вложения в материальные активы	**130**	**1 761**	**1 867**
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	1 761	1 867
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	1 159	696
Долгосрочные финансовые вложения	150	1	1
Отложенные налоговые активы	160	1	1
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
в том числе аккредитивы	171	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**107 508**	**130 440**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	**210**	**18 014**	**14 528**
В том числе:			
материалы	211	8 433	6 664
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	4 892	5 688
готовая продукция и товары	214	4 689	2 056
товары отгруженные	215	-	120
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	350	369
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	431	104
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	13 844	11 601
в том числе аккредитивы	251	-	-
